Медыкі раяць не забываць, што чалавек павінен сам сачыць за сваім здароўем. Большасць з нас 8 гадзін праводзяць на працы. Ці магчыма арганізаваць правільнае харчаванне ва ўмовах працоўнага дня? СТАР 3

«Збіраючыся ў дарогу, матуля заўсёды ва ўсе кішэні клала запіскі з адрасам, тэлефонамі, каб ведалі, хто і адкуль, калі, не дай Бог, на вуліцы памрэ. А аказваецца, і дакументы не гарантыя…» СТАР 5

У жыццёвым прызванні — архітэктуры — Леанід Левін дакладна ведае цану і сваім уласным работам, і работам калег. Права на строгую ацэнку даюць яму не толькі высокія ўзнагароды, але і высокая планка зробленага. СТАР 6

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 САКАВІКА 2013 г. ЧАЦВЕР № 47 (27412) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

УСТАНОЎЛЕНЫ АБМЕЖАВАННІ НА НАБЫЦЦЁ СЛУЖБОВЫХ ЛЕГКАВЫХ АЎТАМАБІЛЯЎ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 12 сакавіка падпісаў указ № 119 «Аб упарадкаванні набыцця службовых легкавых аўтамабіляў».

У мэтах рацыянальнага выкарыстання сродкаў, выканання плацежнай дысцыпліны нормамі ўказа ўстанаўліваюцца абмежаванні на набыццё службовых легкавых аўтамабіляў юрыдычнымі асобамі, якія маюць пратэрмінаваную запазычанасць, а таксама абмежаванне па яго кошту.

Юрыдычным асобам прадастаўляецца права набыцця на аплатнай аснове, у тым ліку па дагаворах фінансавай арэнды (лізінгу), службовых легкавых аўтамабіляў толькі пры адсутнасці на працягу апошніх трох каляндарных месяцаў да даты іх набыцця (заключэння дагавора) пратэрмінаванай запазычанасці па заработнай плаце, за спажытыя энергарэсурсы, па абавязковых плацяжах у бюджэт, дзяржаўныя мэтавыя бюджэтныя і пазабюджэтныя фонды, па крэдытах, атрыманых пад гарантыю ўрада, а таксама пад гарантыі, выдадзеныя мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі. Гэта норма не распаўсюджваецца на юрыдычныя асобы, якім прадастаўлена адтэрміноўка (растэрміноўка) пагашэння пратэрмінаванай запазычанасці або ўстаноўлены іншыя меры дзяржаўнай падтрымкі па яе пагашэнні.

Кошт службовага легкавога аўтамабіля, што набываецца дзяржаўнымі органамі, дзяржаўнымі юрыдычнымі асобамі, гаспадарчымі таварыствамі, у статутных фондах якіх больш за 50 працэнтаў акцый (долей) знаходзіцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь і (або) яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, а таксама сельскагаспадарчымі арганізацыямі з доляй дзяржавы ў статутным фондзе, не павінен перавышаць суму, эквівалентную 25 тыс. еўра з улікам мытных плацяжоў, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Беларусі.

За перавышэнне ўстаноўленага заканадаўствам кошту набываемага службовага легкавога аўтамабіля, а таксама за яго набыццё пры наяўнасці пратэрмінаванай запазычанасці прадугледжваецца накладанне на кіраўніка дзяржаўнага органа або юрыдычнай асобы штрафу ў памеры ад 600 да 1 000 базавых велічынь (цяпер адна базавая велічыня складае Br100 тыс.).

Указ уступіць у сілу праз адзін месяц пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ПУХАВІЦКІ «ЭРМІТАЖ»

Дырэктар музея Аляксандр ПРАНОВІЧ (справа), захавальнік фондаў Наталля МІХАСЁВА і навуковы супрацоўнік Таццяна ПРЫСЯЖНІК.

Мастацкая галерэя Пухавіцкага раённага краязнаўчага музея налічвае ў сваіх фондах каля 500 арыгінальных твораў выяўленчага мастацтва і скульптуры і заслугоўвае права лічыцца адной з найбольшых і багацейшых на Міншчыне. Алейныя палотны, графічныя аркушы і малюнкі належаць майстрам пэндзля і алоўка розных пакаленняў, розных стыляў і школ. Гонар для галерэі найперш у тым, што большаць мастакоў паходзіць менавіта з пухавіцкай зямлі альбо мае да яе хоць якое-небудзь дачыненне.

Галерэя адкрылася ў 2002 годзе, калі сабраная калекцыя твораў літаральна «прасілася» ў экспазіцыю. Галоўным калекцыянерам і стваральнікам унікальнага мар'інагорскага «эрмітажа» стаў Аляксандр Прановіч — гісторык і дырэктар музея.

— У музейнай калекцыі мы маем творы Мікалая Дучыца, Івана Ціханава, Уладзіміра Сухаверхава і Уладзіміра Сулкоўскага, Леаніда Гоманава, Анатоля Бараноўскага, Леаніда Леўчанкі, Нінэль і Лады Шчасных, Васіля Барташэвіча і Леаніда Гурбо, Аляксандра Пашкевіча і Мікалая Мішчанкі, Барыса Рэпіна і Валяр'яна Жолтака — усяго больш за 20 аўтараў. Некаторыя з гэтых асоб з'яўляюцца прадстаўнікамі беларускай школы сацрэалізму. Іх творы — ужо класіка, — распавядае Аляксандр Аляксандравіч Прановіч, калі яму даводзіцца рабіць экскурсіі для наведвальнікаў. А гэткіх экскурсій тут багата. — Двойчы на месяц у нас адбываюцца адкрыцці выставак сучасных мастакоў, а для твораў удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Генрыха Бржазоўскага адведзена нават асобная зала.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

ЦЫТАТА ДНЯ

Мікалай МЕЛЬЧАНКА, намеснік міністра ўнутраных спраў, начальнік міліцыі грамадскай бяспекі:

«Мы праводзім работу па стварэнні інтэлектуальнай сістэмы бяспекі ў Мінску. Гэта асабліва актуальна сёння, пры падрыхтоўцы да забеспячэння грамадскай бяспекі падчас чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 годзе. Вызначаны асноўныя патрабаванні да сістэм бяспекі і тэхнічныя патрабаванні да сістэм відэаназірання, пералік аб'ектаў, якія падлягаюць абсталяванню найноўшымі сістэмамі відэаназірання і радыёсувязі. У першую чаргу ў гэты пералік увайшлі аб'екты метрапалітэна, аўтавакзалы, чыгуначны вакзал, аэрапорты Мінск-1 і Нацыянальны аэрапорт «Мінск», спартыўныя і выставачныя комплексы, шэраг адміністрацыйных будынкаў».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.03.2013 г.

Долар ЗША	8620,00	▼
Еўра	11230,00	▲
Рас. руб.	280,50	■
Укр. грыўня	1061,31	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	– 4°
Віцебск	– 6°
Гомель	+ 1°
Гродна	– 7°
Магілёў	– 1°
Мінск	– 5°

«МЫ ЖЫВЁМ У СВЕЦЕ, ДЗЕ МНОГІМ НАРОДАМ НЕ ДАЗВОЛЕНА ВЫРАШАЦЬ СВОЙ ЛЁС»

Тое, наколькі Сербія і Беларусь блізкія па духу, адчувалася яшчэ да таго, як Прэзідэнт Рэспублікі Сербія Таміслаў НІКАЛІЧ і Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Антоль РУБІНАЎ увайшлі ў залу міжнародных перамоў верхняй палаты парламента. Гэта было відаць па шчырых усмешках, па жартах і прыязнасці, якімі абменьваліся ўдзельнікі сустрэчы. Так, даведаўшыся, што будынак, у якім нядаўна размясціўся Савет Рэспублікі, раней належаў Нацыянальнай бібліятэцы, нехта з сербскай дэлегацыі з вясёлай усмешкай паведаміў, што ў Сербіі ёсць вельмі добры рэстаран, які называецца «Бібліятэка», што сведчыць пра асаблівую любоў сербаў да... кніг.

Душэўнасць і ўдзячнасць пераважала над простай ветлівасцю і ў вітальных словах спікера верхняй палаты парламента.

— Для нас вялікае задавальненне і вялікі гонар прымаць вас тут у сябе, бо вы з'яўляецеся Прэзідэнтам Рэспублікі Сербія, якая вельмі блізкая нам па духу, традыцыях нашых народаў, па агульнай гісторыі і па асабістых адносінах, кантактах паміж нашымі людзьмі, як на ўзроўні кіраўніцтва, так і на іншых узроўнях, — звярнуўся Антоль Рубінаў да высокага госця. — Ваш візіт — вельмі значная падзея ў гісторыі нашых краін... Нацыянальны сход зробіць усё магчымае, каб умацаваць адносіны паміж Беларуссю і Сербіяй.

Аднак з гэтай душэўнай атмасферай некалькі кантрасціравалі словы прэзідэнта Сербіі, якія былі сказаны ў адказ. Яны былі такімі ж шчырымі, але ў іх адчувалася горыч.

— Я ніколі не мяняў свайго стаўлення да Беларусі, — заверыў Таміслаў Нікаліч. — Я часта бачу ў лёсе Беларусі лёс Сербіі. Справа ў тым, што мы жывём у свеце, у якім многім народам не дазваляецца мець сваю пазіцыю і вырашаць свой лёс. А паколькі мы не можам паляцець куды-небудзь з зямнога шара, то нам прыходзіцца ў гэтым свеце неяк уладкоўвацца.

Прэзідэнт Сербіі падзякаваў Беларусі за непрызнанне незалежнасці Косава і Метохіі. Ён заўважыў, што такім прызнаннем Беларусь магла б атрымаць лепшыя пазіцыі ў ЕС, аднак не пайшла на гэтую здзелку. «А што б вы зрабілі, каб такое адбылося ў вашай дзяржаве, пытаюся я ва ўсіх прэзідэнтаў свету. Ці размаўлялі б увогуле? А мы вядзём перамовы,» — заўважыў Таміслаў Нікаліч.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

■ Бяспека спажыўца

ЛЕГАЛЬНЫ АНЛАЙН-ГАНДАЛЬ І «МАБІЛЬНЫ» ПАКУПНІК

У Беларусі вырасла колькасць зарэгістраваных інтэрнэт-крам, паведаміла намеснік міністра гандлю Ірына НАРКЕВІЧ.

— У 2012 годзе, пасля ўвядзення абавязковай рэгістрацыі інтэрнэт-крам, зарэгістравана 3920 такіх аб'ектаў, у параўнанні з мінулым годам — больш на 40%. У бліжэйшым будучым сферу інтэрнэт-гандлю ў Беларусі чакае яшчэ адна навацыя — адказнасць пляцовак, на якіх знаходзяцца інтэрнэт-крамы. Пляцоўкі будуць абавязаны аказваць садзеянне пры вырашэнні пытанняў са спажыўцамі, — адзначыла намеснік міністра.

Таксама было сказана, што апошнім часам у грамадзян узнікае шмат пытанняў наконт дзейнасці мікрафінансавых арганізацый, якія выдаюць пазыкі, альтэрнатыўныя крэдытам у банках. Людзі скардзяцца, што ў рэкламе такіх арганізацый не пазначаецца інфармацыя аб працэнце, пад які даецца пазыка, не агаворваюцца тэрміны выкарыстання грошай.

Гаворачы пра паслугі мабільных аператараў, Ірына Наркевіч узгадала, што пасля таго, як на мабільных аператараў лёг абавязак паведамляць карыстальнікам інфармацыю аб павышэнні тарыфаў за 10 дзён да гэтай падзеі, даваць звесткі пра сам факт павышэння сталі, але якія менавіта тарыфы і наколькі павышаюцца, часта не паведамляюць.

Сёлета Міністэрствам гандлю было разгледжана 6,5 тысячы зваротаў грамадзян. Спажыўцы атрымалі 300 мільёнаў рублёў кампенсацый. У асноўным людзі скардзяцца на паслугі гандлю. Гэта 45% ад усёй колькасці скаргаў. Часцей за ўсё людзі сутыкаюцца з парушэннем тэрміну прыдатнасці прадуктаў, неналежнай маркіроўкай, няправільным афармленнем цэннікаў. Наступнымі ў ліку асноўных скаргаў спажыўцоў — паслугі сувязі і банкаўскія паслугі — 13% ад усёй колькасці зваротаў, а таксама жыллёва-камунальныя — 6%.

Дадатковай крыніцай для таго, каб спажыўцы маглі атрымаць максімальную інфармацыю пра тавар, у Беларусі можа стаць банк электронных пашпартоў тавараў. Карыстацца звесткамі адтуль можа любы ўладальнік мабільнага тэлефона, які працуе на «андроідзе». Сёння ў гэтай базе, створаным беларускімі навукоўцамі, — больш за 8 мільёнаў найменняў тавараў, асноўная колькасць з якіх — беларускія. Механізм карыстання банкам электронных пашпартоў наступны: на сайце спампоўваецца спецыяльная праграма для мабільнага тэлефона, з дапамогай камеры мабільнага сканіруецца штрыхавы код, пасля чаго спажывец можа даведацца найменне тавару, яго вытворцу, інфармацыю пра сертыфікат адпаведнасці, гігіенічны сертыфікат, а таксама некаторыя іншыя звесткі.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

■ Саюзная дзяржава

ЦТ І АДЗІНЫ ДЗЯРЖЭКЗАМЕН: УНІФІКАЦЫЯ НЕМАГЧЫМАЯ?

Міністр адукацыі нашай краіны Сяргей МАСКЕВІЧ упэўнены, што існаванне адзінага дзяржэкзамену ў Расіі і цэнтралізаванага тэсціравання ў Беларусі не перашкаджае рэалізацыі роўных правоў беларусаў і расіян на атрыманне вышэйшай адукацыі ў суседняй краіне.

Нагадаем, што пытанне «канвертацыі» вынікаў ЦТ і АДЭ ўзнімаецца пастаянна. Аўтары гэтай ідэі выступаюць за стварэнне шкалы пераводу вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання ў вынікі АДЭ. Выказваюцца таксама ідэі гарманізацыі дзвюх сістэм.

На мінулым тыдні ў Пастаянным камітэце Саюзнай дзяржавы адбылася рабочая нарада міністраў адукацыі Беларусі і Расійскай Федэрацыі.

— Спецыяльна падладжваць ЦТ пад АДЭ або ствараць нейкі агульны ўступны экзамен мы не збіраемся, — заявіў пасля нарады Сяргей Маскевіч журналістам. — У нас няма на сёння для гэтага ніякіх падстаў. Тым больш нельга супастаўляць вынікі адзінага дзяржэкзамену і цэнтралізаванага тэсціравання, паколькі гэта прынцыпова розныя сістэмы ацэньвання.

У Беларусі ЦТ выкарыстоўваецца толькі як форма ўступных іспытаў у ВНУ і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Гэта абітурыенцкае тэсціраванне, асноўныя мэты якога — ацаніць адрозненні ва ўзроўні падрыхтоўкі абітурыента, параўнаць яго індывідуальныя вынікі з вынікамі іншых удзельнікаў і вызначыць адносную пазіцыю ў групе тых, хто трымае іспыты. Вынікі такіх экзаменаў дазваляюць вызначыць рэйтынг кожнага абітурыента ў адпаведнасці з узроўнем яго падрыхтоўкі. СТАР 2

■ На слыху

Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ:

«ГЭТА ПАЧАТАК НОВАГА ШЛЯХУ У ГІСТОРЫІ КАСЦЁЛА»

Распачатыя ў Ватыкане выбары новага Папы Рымскага выклікалі ў свеце вялікі рэзананс. Што казаць, калі інфармацыю пра канклаў з Апостальскай сталіцы і Рыма перадаюць больш за 5 тысяч прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі! Гэтая падзея літаральна прымушае сачыць многіх за апошнімі навінамі з Апенінаў. І зусім не дзіўна, калі добрая частка італьянцаў глядзела не матч «Барселоны» з «Міланам», а чакала найперш навін з Ватыкана. У Беларусі, дзе здаўна чакаюць візіту Папы, за выбарамі вернікі не проста сочаць, а, адпаведна, моляцца. Менавіта падобнае адмысловае набажэнства на днях узначаліў архіепіскап Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі Тадэвуш Кандрусевіч.

Сёлетні канклаў — з'ява ва ўсіх сэнсах нечаканая, адметная. Хаця б толькі тым, што новага пантыфіка выбіраюць пры жывым Бенедыкце XVI, які спаслаўся на стан здароўя, пайшоў у адстаўку і атрымаў тытул Ганаровы «Папа Рымскі». У мінскім архікафедральным касцёле знакамітага хрысціянскага мысляра Ёзафа Ратцынгера, які стаў 265-м Папам, таксама ўзгадавалі, дзякавалі яму, праўда, пераважна маліліся за тых 115 кардыналаў, якія зараз выбіраюць новага наступніка святога Пятра. «Мы сабраліся ў нашым кафедральным касцёле, каб злучыцца з усімі вернікамі, кардыналамі, што адчуваюць на сабе вялікую адказнасць за будучае Касцёла, — пранікнёна звярнуўся да запоўненага неабыякавымі людзьмі храма **Мітрапаліт Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ.** — Маліцца да Святога Духа, каб паказаў ім на таго, хто ўжо праз некалькі дзён павядзе Касцёл у будучыню».

Цікава, адразу пасля імшы для веруючых арганізавалі нядоўгую трансляцыю з Ватыкана, дзе вось-вось павінна было распачацца галасаванне. На экране бачны засяроджаныя кардыналы, якія нетаропка рухаюцца з Паўлінскай капэлы, што ў Апостальскім палацы, спяваюць Літанію да Усіх Святых, а трапіўшы ў Сікстыну, кожны займае сваё месца, прысягае. Ужо пасля ксёндз прэлат Гвіда Марыні, цырымоній-майстар Папы, кажа традыцыйныя для гэтага моманту словы («Усе сыходзяць») і зачыняе дзверы ў вядомую капэлу. З гэтага часу доступ да кардыналаў забаронены: пачынаюцца пасля службы выбары. Між іншым, большасць вернікаў мінскую святыню не пакінула і разам з Тадэвушам Кандрусевічам убачыла чаканую трансляцыю. Аказваецца, асоба новага пантыфіка сапраўды хвалюе беларусаў. СТАР 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

MCDONALD'S У ЗША ЗРАБІЎ ЗАМЕЖНІКАЎ РАБАМІ

Рэстаран хуткага харчавання McDonald's аказаўся ў ЗША ў цэнтры скандалу. Замежныя студэнты, якія прыехалі працаваць па праграме Summer Work and Travel, апынуліся ў палоне ў працадаўцы.

Студэнтам з Аргенціны, Бразіліі, Чылі, Парагвая, Перу і Малайзіі даводзілася працаваць больш за 40 гадзін на тыдзень. Пры гэтым плацілі ім значна менш, чым было першапачаткова абумоўлена ў кантракце. На мінулым тыдні студэнты арганізавалі ў Гарысбергу страйк супраць парушэнняў працоўнага заканадаўства гігантам індустрыі фаст-фуду. Дэманстрацыю падтрымалі амерыканскія прафсаюзы. Раней дзве ўкраінкі замест абяцанай працы афіцыянткамі ў Вірджыніі былі вымушаны працаваць стрыптызёркамі ў Дэтройце.

ВЯЛІКІЯ МЕТЭАРЫТЫ Ў БЛІЖЭЙШАЕ СТАГОДДЗЕ ЗЯМЛІ НЕ ПАГРАЖАЮЦЬ

У бліжэйшае стагоддзе якой-небудзь пагрозы Зямлі з боку касмічнага аб'екта дыяметрам больш за кіламетр не прадбачыцца. Пра гэта заявілі прадстаўнікі Ініцыятыўнай групы экспертаў ААН. Каментуючы нядаўняе падзенне метэарыта ў Расіі, якое ўскалыхнула ўсю сусветную супольнасць, гэтая група заклікала да каардынацыі міжнародных намаганняў па супрацьстаянні пагрозам сутыкнення з астэроідамі і іншымі аб'ектамі.

У ТУРЦЫІ ЎКРАЛІ 22-ТОННЫ МОСТ

Зламыснікі ў Турцыі распілавалі і звезлі 25-метровы мост вагой амаль 22 тоны. Мяркуецца, што яго разабралі на металалом, а сума выручкі можа дасягаць 11 тысяч долараў. Невядомыя разрэзалі канструкцыю на некалькі частак, пагрузілі ў грузавік і з'ехалі. Знайсці зламыснікаў па гарачых слядах не атрымалася. Цяпер мясцовым жыхарам прыйдзецца штодня перабірацца праз раку ўброд. На другім беразе размешчаны фруктовыя сады, якія прыносяць ім асноўны прыбытак, а новы мост наўрад ці ўзвядуць у бліжэйшы час.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

У ГЕРМАНІІ ПАМЁР АПОШНІ ЎДЗЕЛЬНІК ЗАМАХУ НА ГІТЛЕРА

У Мюнхене ва ўзросце 90 гадоў памёр Эвальд-Хайнрых фон Кляйст, які з'яўляўся апошнім выжыўшым удзельнікам змовы ваенных і няўдалага замаху на Адольфа Гітлера ў ліпені 1944 года.

Эвальд-Хайнрых фон Кляйст паходзіў з арыстакратычнай сям'і і пасля пачатку Другой сусветнай вайны пайшоў на ваенную службу. У 1944 годзе ён далучыўся да змовы высокапастаўленых ваенных вермахта, незадаволеных палітыкай Гітлера, у якой таксама ўдзельнічаў яго бацька, Эвальд фон Кляйст-Шменцын, які даўно быў праціўнікам фюрэра. Кляйст-малодшы зблізіўся са змоўшчыкамі ў студзені 1944 года. Яму было 22 гады, калі ў Берліне адбылася яго сустрэча з палкоўнікам Клаўсам Шэнкам фон Штаўфенбергам, які пасля адыграў ключавую ролю ў замаху на Гітлера.

Аднак план праваліўся, большасць удзельнікаў, а таксама тых, хто ведаў пра змову, была расстраляна. Усяго ў сувязі з гэтым было пакарана 5 тысяч чалавек, у тым ліку бацька Кляйста. Самому ж маладому чалавеку ўдалося ўтаіць сваё дачыненне да змовы. Нягледзячы на гэта, ён быў арыштаваны і некалькі месяцаў правёў у канцлагеры. Пасля вайны фон Кляйст займаўся выдавецкай дзейнасцю.

КАРАТКА

Новы тыпавы дагавор аб сумесным домаўладанні зацверджаны ў Беларусі. У дагаворы дакладна вызначаны правы і абавязкі яго ўдзельнікаў (уласнікаў аб'ектаў нерухомай маёмасці). Ён падпісваецца ўдзельнікамі для забеспячэння захаванасці і ўтрымання агульнай маёмасці ў належным тэхнічным і санітарным стане, а таксама для вырашэння пытанняў валодання і карыстання гэтай маёмасцю.

Нацыянальная авіякампанія «Белавія» з 31 сакавіка ўводзіць дадатковы рэйс Мінск — Стамбул — Мінск і павялічвае частату палётаў у сталіцу Турцыі да чатырох разоў на тыдзень.

З 20 па 30 сакавіка ў Беларусі пройдзе акцыя пад назвай «Дзяржтэхагляд», накіраваная на ўзмацненне кантролю за своечасовым праходжаннем вадзіцелямі дзяржтэхагляду іх транспартных сродкаў. У час акцыі спецыяльныя групы, у склад якіх увойдуць прадстаўнікі ДАІ, Транспартнай інспекцыі Міністэрства транспарту і камунікацый і «Белтэхагляду», будуць асабліва ўважлівыя да аўтаўладальнікаў, аўтамабілі якіх своечасова не прайшлі дзяржтэхагляд. У першую чаргу спецыялісты будуць правяраць аўтамабілі, якія выкарыстоўваюцца без дазвольнай наклейкі на ветравым шкле, а таксама транспартныя сродкі, якія маюць яўныя неадпаведнасці па знешнім выглядзе.

УМОВЫ ПАСТАВАК РАСІЙСКАЙ НАФТЫ Ў БЕЛАРУСЬ У ДРУГІМ КВАРТАЛЕ БУДУЦЬ ЛЕПШЫЯ, ЧЫМ У ПЕРШЫМ

Умовы паставак расійскай нафты ў Беларусь у другім квартале гэтага года будуць крыху лепшыя, чым у першым квартале, паколькі аб'ёмы транспарціроўкі нафты трубаправодным транспартам павялічацца адпаведна з 5,025 млн т да 5,3 млн т. Аб гэтым БелТА паведамілі ў прэс-службе беларускага ўрада.

Як паведамлялася, Беларусь і Расія ўзгаднілі аб'ёмы паставак нафты ў другім квартале 2013 года ў аб'ёме 5,75 млн т. Адпаведная дамоўленасць дасягнута па выніках перагавораў першага намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Уладзіміра Сямашкі і намесніка старшыні ўрада Расіі Аркадзя Дварковіча, якія прайшлі ў Маскве 11-12 сакавіка. «Перагаворы па балансе паставак нафты ў трэцім і чацвёртым кварталах гэтага года будуць прадоўжаны. Усяго ў 2013 годзе Беларусь плануе імпартаваць 23 млн т расійскай нафты», — дадалі ў прэс-службе. Акрамя таго, у час перагавораў у Маскве абмеркаваны перспектывы рэалізацыі буйных сумесных беларуска-расійскіх інтэграцыйных праектаў. Бакі намецілі практычныя крокі па іх выкананні.

ЦТ І АДЗІНЫ ДЗЯРЖЭКЗАМЕН: УНІФІКАЦЫЯ НЕМАГЧЫМАЯ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А ў Расіі адзіны дзяржаўны экзамен уніфікаваны па форме і змесце як для выпускнікоў сярэдніх школ, так і для абітурыентаў ВНУ і ССНУ, а кантрольна-вымяральныя матэрыялы служаць як мэтам выніковай атэстацыі выпускнікоў сярэдніх школ, так і выступаюць у якасці сродку адбору прэтэндэнтаў на студэнцкае месца.

Аналагічны пункт гледжання выказаў і **міністр адукацыі і навукі Расіі Дзмітрый Ліванаў:**

— Мы не бачым праблемы ў тым, што ў нас практыкуюцца розныя сістэмы ацэньвання, паколькі сёння няма ніякіх абмежаванняў для грамадзян Беларусі ў здачы адзінага дзяржэкзамена ў Расіі для паступлення ў ВНУ на бюджэтныя месцы. Расіяне таксама могуць прыняць удзел у цэнтралізаваным тэсціраванні для паступлення ў беларускія ВНУ.

Сёння ў беларускіх ВНУ навучаюцца каля 2 тысяч расіян, а ў расійскіх ВНУ — каля 20 тысяч беларусаў. І ёсць меркаванне, што такая статыстыка (не на карысць беларускіх ВНУ) часткова абумоўлена не вельмі зручнымі для расіян тэрмінамі правядзення ў Беларусі цэнтралізаванага тэсціравання. Выпускнікі расійскіх школ бягучага года не паспяваюць паўдзельнічаць у ЦТ, паколькі ў чэрвені яны здаюць выпускныя экзамены ў школах. Таму карэкціроўка тэрмінаў правядзення ўступных іспытаў дазволіла б павялічыць прыток у Беларусь расійскіх абітурыентаў.

Між іншым, з 2012 года ў грамадзян Расійскай Федэрацыі з'явілася магчымасць паступаць у беларускія ВНУ і ССНУ на платную форму навучання на ўмовах, прадугледжаных для іншаземцаў, гэта значыць, толькі па выніках гутаркі. У большасці расійскіх ВНУ і ССНУ прыём беларусаў для навучання на платнай аснове таксама ажыццяўляецца па выніках гутаркі, пры гэтым тэрміны падачы дакументаў фактычна не абмежаваны, а навучанне распачынаецца па меры камплектавання груп.

Па выніках рабочай сустрэчы Сяргей Маскевіч і Дзмітрый Ліванаў таксама агучылі намер арганізаваць абмен студэнцкімі атрадамі паміж дзвюма краінамі. Міністэрствы адукацыі плануюць аказваць падтрымку ініцыятывам як з боку працадаўцаў, якія пажадаюць прадаставіць студэнтам працоўныя месцы, так і з боку ВНУ, якія арганізуюць студэнцкія атрады. Гэта і іншыя актуальныя тэмы будуць падрабязна абмяркоўвацца ў маі бягучага года на сумесным пасяджэнні калегіі міністэрстваў адукацыі Беларусі і Расіі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Блізкая ўлада

СВАЯ ПЕРСПЕКТЫВА

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік на прыёме грамадзян разбіраўся з турбінамі, газам і, як заўсёды, з жыллём.

Фермер — вынаходнік

Уладзімір Карпянкоў з Бялынічаў прыехаў да кіраўніка абласной улады з цікавай прапановай. Ён расказаў, што распрацаваў турбіну новага пакалення, якая дазваляе атрымліваць энергію з малых рэк нават пры невялікім перападзе вады. У сваёй майстэрні і з дэталяў спісанага ваеннага абсталявання Уладзімір зрабіў вопытны ўзор і ўсталяваў яго на рацэ Няропля паблізу Бялынічаў і пратэінавага завода.

У гэтага вынаходніцтва (калі планы спраўдзяцца, а разлікі пацвердзяцца) можа быць вялікая будучыня. Турбіны, якія цяпер вырабляюцца, звычайна эфектыўныя пры перападах вады больш за 2 метры. Бялыніцкая турбіна можа даваць энергію і ўвогуле без перападаў, толькі за кошт патоку. На гэта ёсць ужо і навуковыя водгукі. Таму Карпянкоў падаў заяўку на патэнт.

Сам Уладзімір мае фермерскую гаспадарку, займаецца пчалярствам. Яго бацька быў вынаходнікам у лясной справе, і цяпер сын знаходзіць і ўвасабляе ў жыццё новыя ідэі ў розных сферах. Новы тып гідраэлектрастанцыі — адна з іх.

Пётр Руднік лічыць, што турбіна Карпянкова — актуальная рэч, бо яна дазваляе атрымліваць больш танную энергію. Такіх невялікіх рэчак, як Няропля, у Магілёўскай вобласці шмат.

Тым больш, што распрацаваць сваю турбіну, якая б каштавала танней за заходнія аналагі, старшыня аблвыканкама яшчэ раней даручыў магілёўскім прадпрыемствам. Справа ў тым, што нядаўна ў Александрыі Шклоўскага раёна на рацэ Ульянаўка ўсталявалі польскую турбіну, якая каштавала больш за 100 тысяч еўра. Бялыніцкі аналаг абыдзецца ў разы танней! Патрэба ёсць: жыллёва-камунальная гаспадарка мяркуе сёлета ўсталяваць дзве турбіны на ачышчальных збудаваннях Магілёва і Бабруйска.

Таму Пётр Руднік даручыў тэрмінова дапрацаваць вопытны ўзор на Няроплі да прамысловага, і гэтыя работы будуць фінансавацца з абласнога інавацыйнага фонду. Да справы падключацца прадпрыемствы і ўніверсітэцкія навукоўцы. Тэрмін сціслы — толькі месяц, ужо ў першым паўгоддзі кіраўніцтва разлічвае атрымаць афіцыйныя вынікі аб эфектыўнасці турбіны.

Вясковы пасол

Пенсіянерка Аляўціна Мільто прыехала заступіцца за правы сваёй вёскі — Нікалаеўкі-1 Магілёўскага раёна. Жыхары, якія стварылі кааператыў, хвалююцца за газ. Ужо цалкам гатовы праект для правядзення ў вёску прыроднага газу, але ў людзей ёсць сумненні, ці ўвасобіцца ён сёлета ў жыццё, як раней планавалася.

Старшыня Магілёўскага райвыканкама Дзмітрый Гобараў праінфармаваў, што ў раёне створана 36 кааператываў. Будаўніцтва газапаводаў вядзецца па парадку, ад моманту гатоўнасці праекта. Сёлета на чарзе дзве вёскі — Палавінны Лог і Нікалаеўка-1. Работы хутка пачнуцца. Але рэаліі такія, што выдаткаваных грошай на газіфікацыю двух паселішчаў адразу не хапае.

Аднак Пётр Руднік супакоіў «пасла» вёскі: ніхто не будзе абдзелены. Грошы знойдуцца, і ён нават даручыў газавікам зрабіць усё і падвесці газ да свята 3 ліпеня — як падарунак вяскоўцам.

Між тым, Аляўціна Мільто паставіла за адным разам на парадак дня яшчэ некалькі пытанняў: асвятленне вуліц, крытыя прыпынкі для грамадскага транспарту, а таксама якасць вады. Якраз апошняя праблема — вельмі актуальная для Магілёўскага раёна.

У тутэйшых вёсках ёсць патрэба ў двух дзясятках станцый абезжалезівання, і мясцовыя ўлады робяць шмат для вырашэння праблемы, але вада ў бутэльцы, якую паставіла на стол на прыёме грамадзян жыхарка Нікалаеўкі-1, была ржавая.

Справа тут яшчэ і ў старым водаправодзе, дзе за чатыры дзясяткі гадоў сапсаваліся металічныя трубы. Для таго, каб пракласці па вёсцы пластыкавыя трубы новага пакалення, патрабуецца некалькі мільярдаў рублёў. Таму Пётр Руднік настойліва папрасіў падумаць пра план удзелу (маецца на ўвазе, фінансавага) у вырашэнні надзённай праблемы з чыстай вадой саміх жыхароў. У сітуацыі, калі ў дзяржаве на ўсё не хапае сродкаў, трэба прыцягваць і сродкі людзей, калі яны на гэта згодныя.

Не чакаць, а будавацца

Большасць пытанняў на прыёме грамадзян традыцыйна датычыцца жылля — новага і старога. Прадстаўнікі жыллёва-будаўнічых кааператываў хвалююцца за тэрміны здачы дамоў і кошт квадратных метраў, а перасяленцы са старога, без выгод, жылля імкнуцца палепшыць свае жыллёвыя ўмовы.

Жыхар Магілёва прыйшоў па кансультацыю: ён мае двух дарослых сыноў, дзеці імкнуцца стварыць свае сем'і, яны шмат працуюць і стаяць у чарзе на атрыманне жылля, але жыць пакуль даводзіцца ў адной бацькоўскай кватэры. «Ці ёсць перспектывы для вырашэння такой праблемы?» — запытаўся мужчына.

— Перспектыва ў тым, каб не чакаць, а будаваць сваё жыллё, — адказаў Пётр Руднік.

Ён расказаў, што сёлета ў Магілёўскай вобласці мяркуюць пабудаваць 600 квадратных метраў новага жылля, а гэта ў паўтара раза больш за год мінулы. Частку гэтага жылля атрымаюць людзі, якія, згодна з законам, маюць права на льготнае крэдытаванне. Іншая частка — гэта камерцыйнае жыллё, дзе трэба разлічваць на ўласныя сродкі і крэдыты. Банкі цяпер прапануюць спецыяльныя праграмы для тых кліентаў, якія імкнуцца пабудаваць сваё жыллё.

Таксама, расказаў Пётр Руднік, каля гарадоў сёлета выдзяляюцца людзям зямельныя ўчасткі для індывідуальнага будаўніцтва. Каб сэканоміць час і сілы, можна замовіць у будаўнічай арганізацыі ўзвядзенне «каробкі» і потым самастойна даводзіць яе да пажаданага выгляду і стылю. І нарэшце, сёлета ў Магілёве здаюцца арэндныя дамы, дзе можна зняць кватэру на пэўны час, пакуль жыллёвая праблема не вырашыцца кардынальна.

— Так жыве палова свету! — сказаў старшыня Магілёўскага аблвыканкама. — А далей трэба зарабляць грошы і будавацца. Іншага шляху няма!

Ілона ІВАНОВА

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ

ХУТКА — ЧАРГОВЫ СЕЗОН ПАЛЯВАННЯ

З 20 сакавіка па 30 красавіка з 3 да 9 гадзін дазваляецца збройнае паляванне на таках з падыходу, з засады на самцоў глушца, а таксама збройнае паляванне на таках з засады на самцоў цецерука.

Пры вядзенні палявання на самцоў глушца і цецерука ў веснавым сезоне дазваляецца выкарыстанне наразной паляўнічай зброі з дульнай энергіяй кулі звыш 400 джоўляў і гладкаствольнай паляўнічай зброі з патронамі са шротам.

Як нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, у выпадку змянення ўмоў надвор'я, якія ўплываюць на стан папуляцыі паляўнічых жывёл, Міністэрства лясной гаспадаркі па ўзгадненні з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя можа прымаць рашэнні аб змяненні тэрмінаў палявання, не павялічваючы пры гэтым агульную працягласць паляўнічага сезона. Пры гэтым яны абавязаны паведаміць пра тое паляўнічым і іншым грамадзянам праз сродкі масавай інфармацыі не пазней, чым за пяць дзён да ўступлення такіх рашэнняў у сілу.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«МАГМА» «ЗАПАЛІЛА» НА ЛЁДЗЕ

На мінулых выхадных адбыўся Кубак Рэспублікі Беларусь па спартыўнай лоўлі рыбы з лёду на мармышку. Гэта былі выніковыя спаборніцтвы, якімі заканчваецца зімовы рыбалоўны сезон. Іх арганізатарам традыцыйна выступіла Рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў».

Спаборніцтвы праходзілі на вяслярным канале каля Заслаўя. Пятнаццаць каманд, сярод якіх былі і прадстаўнікі Санкт-Пецярбурга, на працягу двух дзён выяўлялі пераможцаў. У выніку лідарам стала каманда «Магма-1», другое месца — «Фаварыт», трэцяе — «БРІК». У асабістым заліку перамог Аляксандр Мураўёў, які абышоў нават чэмпіёна свету Юрыя Шчорса (той быў трэцім). Другое месца ў Сяргея Драздоўскага. Дарэчы, цалкам верагодна, што чэмпіянат свету па гэтым відзе рыбалоўнага спорту ў наступным годзе пройдзе ў Беларусі.

Наш кар.

«АМАПАЎЦЫ» ДАГНАЛІ КІШЭННІКА

Аўтапатрулю АМАПа паступіла паведамленне, што на прыпынку грамадскага транспарту каля дома № 20 па сталічным праспекце Машэрава знаходзіцца жанчына, у якой укралі кашалёк. Прыбыўшым на месца міліцыянерам пацярпелая расказала, што ў салоне аўтобуса, з якога яна толькі выйшла, каля яе круціўся вельмі падазроны малады чалавек.

«Амапаўцы» запрасілі жанчыну ў машыну і паехалі за аўтобусам. Дагналі яго на наступным прыпынку. У салоне якраз знаходзіўся маладзён, якога западозрыла жанчына. Яго даставілі ў Фрунзенскі РУУС, дзе падчас правядзення асабістага дагляду і знайшоўся зніклы кашалёк. Сваю здабычу кішэннік схаваў пад адзеннем.

ФАКТЫ

ЧАМУ АБАРВАЛІСЯ ЖЫЦЦІ?

У Мінску на праспекце Ракасоўскага адбыўся пажар, на якім загінулі тры чалавекі. Работнікам МНС давялося эвакуіраваць суседзяў.

Пра загаранне ў кватэры на апошнім паверсе пяціпавярхоўкі стала вядома каля гадзіны ночы. Пры тушэнні пажару выратавальнікі знайшлі без прыкмет жыцця 59-гадовую гаспадыню кватэры і яе 29-гадовага пляменніка. У суседнім пакоі на ложку знайшлі цела 88-гадовай жанчыны. З суседніх кватэр работнікам МНС давялося эвакуіраваць чатырох чалавек.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПА ЛЯСАХ І БАЛОТАХ

рухаліся кантрабандысты з таварам, а потым грузілі ўсё ў машыну. У Драгічынскім раёне пінскія памежнікі затрымалі грузавік «ГАЗ-66» без нумарных знакаў, запоўнены розным таварам.

У кузаве знаходзілася 30 газавых балонаў, дзевяць вялізных баулаў з адзеннем, абуткам, скрынкі з запчасткамі для скутараў, веласіпедаў, бензапілы і запчасткі да іх. Адным словам, тавару назбіралася на некалькі мільярдаў. Як высветлілася, парушальнікі праносілі тавар праз украінскую мяжу пехатой, потым складвалі рэчы ў кузаў аўтамабіля.

Яна СВЕТАВА.

«ГЭТА ПАЧАТАК НОВАГА ШЛЯХУ Ў ГІСТОРЫІ КАСЦЁЛА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Ваша Эксцэленцыя, сёлетні канклаў літаральна жыве сярод розных чутак, здагадак, неабгрунтаваных доказаў жоўтай прэсы. Як павінен адчуваць сябе чалавек у падобнай сітуацыі? Каму верыць зараз?

— Журналісты журналістамі, у іх праца такая, — адказвае на пытанні карэспандэнта «Звязды» Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч. — Але не яны галасуюць, не яны выбіраюць Папу. Гэта робяць кардыналы. Але яны нічога не скажуць, бо існуе таямніца канклава. Зараз трэба проста даверыцца Святому Духу, які ўжо зрабіў свой выбар. Ён не мае рук, не мае ног, не можа нам казаць чалавечым голасам, аднак праз кардыналаў пра свой выбар скажа.

— Зразумела, гэты канклаў ужо далёка не першы ў вашым жыцці. Які ён асабіста для вас?

— Я памятаю выбары, калі памёр Пій XII. Гэта было напрыканцы 1950-х. Я тады яшчэ ў вёсцы жыў ды ў школу хадзіў. Помню, як святар казаў, што недзе там, далёка ў Ватыкане, выбіраюць Папу. Яна Паўла II абралі ўжо тады, калі я быў у семінарыі. Гэта такі адпаведны час чакання, малітвы, пэўнага энтузіязму. Уладзімір Высоцкі тады яшчэ жартам напісаў: маўляў, ватыканскія чыноўнікі праспалі, а мы Папу Рымскага падкінулі, «з нашых, з палякаў, са славян». А калі памёр вялікі, вельмі блізкі для ўсіх нас Ян Павел, які шмат чыніў для адраджэння Касцёла на нашых землях, прыйшоў таксама гігант — Ёзэф Ратцынгер (Бенедыкт XVI). Сёння бачна, што свет вельмі зацікаўлены канклавам. Нават выбары ў самой Італіі зараз адыходзяць дзесьці на другі план. На тое, што адбываецца, я гляджу вачыма веры, таго, што Езус вядзе свой Касцёл праз наступніка святога Пятра, і чакаю рашэння. Напэўна, гэта пачатак новага шляху ў гісторыі Касцёла.

— Папу Бенедыкта XVI называюць знакамітым мысліцелем, хрысціянскім філосафам. Прыход якога пантыфіка можна чакаць зараз?

— Ён таксама павінен быць добрым тэолагам, каб абгрунтавана мог адказваць на выклікі часу. Але патрэбны добры пастыр, святы чалавек, які паказаў бы бязмежную любоў Бога да чалавека. Сёння свет ужо не такі, як быў 50 гадоў таму. Ён не толькі шматнацыянальны, але і поліканфесійны. І гэта рэчаіснасць нашага жыцця, і таго, што не толькі хрысціянскія веравызнанні прыходзяць на зямлю, дзе раней былі толькі хрысціяне. Трэба нейкім чынам шукаць шлях, якім разам трэба будзе не толькі кіравацца, жыць, а разам адказваць на выклікі часу.

— Пытанне датычнае выбараў. Калі адштурхоўвацца ад аднаго меркавання, дык Папам могуць выбраць прадстаўніка таго рэгіёна, які раней не быў прэзентаваны на прастоле. Ці магчыма падобнае?

— Богу ўсё магчыма. Я не магу загадваць. Аднак Касцёл, напрыклад, у Афрыцы, Азіі вельмі моцны і дынамічны. Я ўдзельнічаю ў шматлікіх канферэнцыях, і бачу, як афрыканскі біскуп ідзе з планшэтам і кантактуе з паловай свету. А католікі з краін Лацінскай Амерыкі, між іншым, сёння гэта 60% ад усіх католікаў свету.

— У інтэрнэце натрапіў на інфармацыю пра тое, што ўжо букмекерскія канторы прымаюць стаўкі на выбары Папы. Сярод лідараў называюць міланскага архібіскупа Анджэла Скола, бразільца Адыліу Педру Шэрэра, ганца Пітэра Кодва Турксана.

— Ведаеце, грошы, багацце — гэта вобраз сучаснага секулярнага свету, свету, які патрабуе падобных лекаў. Гэта людзі далёкія ад веры. Ім на гэтым проста трэба зарабіць —больш нічога. Падобнае нагадвае стаўкі на скачкі, што ладзяць на іпадроме. Гэта не суадносіцца адно з другім.

...З пачатку пасяджэння канклава прайшло ўжо некалькі тураў, але з коміна Сікстынскай капэлы пакуль здымаўся толькі чорны дым — прыкмета таго, што пантыфіка кардыналы яшчэ не выбралі. А прыйшлі ўчора да адзінага рашэння ці не, стала вядома, калі нумар быў падпісаны ў друк.

Тарас ШЧЫРЫ.

■ Будзь у курсе

ПА ЭЛЕКТРОННЫМ. БЕЗ АФАРМЛЕННЯ Ў БІЛЕТНАЙ КАСЕ

У рэжыме доследнай эксплуатацыі Беларуская чыгунка ўкараняе паслугу электроннай рэгістрацыі пры набыцці білетаў праз інтэрнэт на большасць міжнародных паяздоў, што курсіруюць у зносінах з Расіяй.

Фота БЕЛТА.

Як паведамілі ў Мінскім аддзяленні Беларускай чыгункі, гаворка ідзе пра паязды: №2/1 Мінск — Масква, №4/3 Мінск — Масква, №8/7 Брэст — Масква, №12/11 Мінск — Масква, №18/17 Ніца — Масква (прычапная група Брэст — Масква), №24/23 Парыж — Масква (прычапная група Брэст — Масква), №36/35 Брэст — Санкт-Пецярбург, №39/40 Полацк — Масква, №52/51 Мінск — Санкт-Пецярбург, №56/55 Гомель — Магілёў — Масква (уключаючы прычапныя групы вагонаў Салігорск — Масква), №78/77 Гродна — Масква, №114/113 Брэст — Новасібірск (за выключэннем бесперасадачнага вагона Брэст — Сургут), №510/509 Брэст — Масква, №516/515 Брэст — Масква, №538/537 Брэст — Масква, №552/551 Брэст — Масква.

Электронная рэгістрацыя на праезд — згода пасажыра на праезд у поездзе на падставе дагавора перавозкі, падмацаванага электронным праязным білетам, без афармлення праязнога білета ў білетнай касе. Электронная рэгістрацыя выконваецца падчас працэдуры заказу электронных праязных дакументаў на сайце Беларускай чыгункі ці ў любы іншы час у асабістым кабінеце не пазней, чым за адну гадзіну да адпраўлення поезда з пачатковай станцыі. Пасадка пасажыраў на паязды міжнародных ліній з электроннай рэгістрацыяй будзе весціся толькі па прад'яўленні дакумента, які сведчыць асобу, што была ўказана пры правядзенні электроннай рэгістрацыі.

Праезд пасажыраў па электронных праязных дакументах з электроннай рэгістрацыяй ва ўсіх паяздах міжрэгіянальных ліній эканом-класа і рэгіянальных ліній бізнэс-класа арганізаваны яшчэ з пачатку лютага. Пасадка ў іх па электронных білетах вядзецца па прад'яўленні праваднiку вагона дакумента, які сведчыць асобу пасажыра (пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, пасведчанне на права жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь, пасведчанне бежанца, ваенны білет, іншы дакумент, які змяшчае фатаграфію, заверaную пячаткай; а пасажыр, які не дасягнуў 14 гадоў, — пашпарт або пасведчанне аб нараджэнні).

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Выстава

Веснавы форум запрашае актыўных!

З 14 па 17 сакавіка ў Мінску ў Нацыянальным выставачным цэнтры «Белэкспа» па вуліцы Янкі Купалы, 27 пройдзе міжнародная спецыялізаваная выстава «Паляванне і рыбалоўства. Актыўны адпачынак. Вясна-2013».

Сёлета ў веснавым форуме абяцаюць узяць удзел больш за 300 экспанентаў. Традыцыйна ў гэтую пару года большасць з іх прадстаўляе тавары для амататараў рыбалкі. Што датычыцца паляўнічых, дык іх на выставе чакае сюрпрыз: падчас форуму павінен прайсці першы адкрыты чэмпіянат па падманванні качак і гусей. Удзельнікі конкурсу павінны будуць зымітаваць крык гэтых птушак, прычым толькі пры дапамозе голасу і самаробных механічных прыстасаванняў. Упершыню падчас выставы пройдзе і дэманстрацыя розных парод паляўнічых сабак. Будзе арганізаваны і продаж тураў выхаднога дня і паляўнічых пуцёвак. Традыцыйна адкрытая пляцоўка перад выставачным комплексам будзе аддадзена пад экспазіцыю маламерных суднаў: катараў, лодак.

Таксама будзе арганізавана выстава паляўнічых трафеяў. Наведвальнікі форуму змогуць убачыць у шырокім асартыменце драўнінна-кустарнікавыя насаджэнні, пушніну, калекцыю адзення з футра. Тут жа будзе арганізаваны продаж дароў лесу.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ КАПИТАЛЬНОГО СТРОЕНИЯ, находящегося в собственности ОАО «Химчистка и стирка белья» 16 апреля 2013 года

№ лота	Наименование объекта, его местонахождение, общая площадь, кв.м	Начальная цена продажи (без учета НДС), руб.	Сумма задатка, руб.	Характеристика объекта	Условия аукциона
1	Капитальное строение (с инвентарным номером 700/С-49439) с пристройкой, тремя верандами, двумя террасами, общей площадью 317,1 кв.м, забором площадью 60,5 кв.м, забором площадью 60,3 кв.м, забором площадью 6,9 кв.м, калиткой площадью 1 кв.м, бетонной плиткой площадью 18,6 кв.м, асфальтовым покрытием площадью 222 кв.м. Капитальное строение (с инвентарным номером 700/С-50141), общей площадью 64,4 кв.м, многолетние насаждения в количестве 32 штук, фруктовые насаждения в количестве 3 штук, кабельная линия ААБ3*95, протяженностью 250 мп., расположенные по адресу: г. Могилев, ул. Карла Маркса, 29	892 769 037	89 276 900	Капитальное строение (с инвентарным номером 700/С-49439) с пристройкой, тремя верандами, двумя террасами, общей площадью 317,1 кв.м – 1939 г. постройки. Фундамент – кирпичный; стены – бревенчатые, обложенные кирпичом; перекрытия – деревянные; кровля – шиферная; полы – дощатые, паркетные, линолеум; проемы – простые. Имеется центральное отопление, электроосвещение, водопровод, канализация, радио, телефон. Забор деревянный сплошной на ж/б столбах площадью 60,5 кв.м. Забор из металлической сетки на бетонных трубах площадью 60,3 кв.м. Забор деревянный сплошной на деревянных столбах, площадью 6,9 кв. Калитка металлическая площадью 1 кв.м. Бетонная плитка площадью 18,6 кв.м. Асфальтобетонное покрытие площадью 222 кв.м. Капитальное строение (с инвентарным номером 700/С-50141), общей площадью 64,4 кв.м. 1995 г. постройки. Фундамент – кирпичный; стены – кирпичные; перекрытия – деревянные; кровля – шиферная; полы – бетонные; двери – металлические. Имеется электропроводка, смотровая яма. Многолетние насаждения – 32 штуки, фруктовые насаждения – 3 штуки, кабельная линия ААБ3*95, протяженностью 250 м.п.	без условий

Аукцион состоится 16 апреля 2013 года в 15.00 в зале заседаний Могилевского городского исполнительного комитета по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.
Заявки принимаются ежедневно с 15 марта 2013 в рабочие дни с 8 до 17 часов по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.
Последний день приема заявок – «12» апреля 2013 года до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона – **16 апреля 2013 года** с 14 до 15 часов.

Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.

Продавец: Открытое акционерное общество «Химчистка и стирка белья», 212030, г. Могилев, ул. Гришина, 90, тел. 26 32 68.

Площадь земельного участка – 0,1542 га для содержания и обслуживания зданий и сооружений.

Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в МГУКП «Центр по приватизации» следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

подписанное с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон;

копию платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на расчетный счет МГ УКП «Центр по приватизации» 3012430089016, Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, МФО 153001739, УНН 700008710.

юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь:

копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; (документ, подтверждающий полномочия должностного лица),

доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя;

юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь:

легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть получена не ранее 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя;

индивидуальным предпринимателям:

копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя;

доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя;

физическим лицам – гражданам Республики Беларусь, физическим лицам – иностранным гражданам:

документ, удостоверяющий личность.

Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником аукциона, предмет торгов по решению аукционной комиссии продается этому лицу при его согласии (далее – лицо, приравненное к победителю аукциона) по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

До подписания договора купли-продажи победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней, не считая дня проведения аукциона, обязан в соответствии со счетом-фактурой возместить организатору аукциона фактические затраты на его организацию и проведение. Договор купли-продажи заключается продавцом и победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение 5 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.

Оплата стоимости приобретенного на аукционе предмета торгов осуществляется победителем (лицом, приравненным к победителю) аукциона в белорусских рублях в установленном порядке.

Условия оплаты – разовый платеж.

С объектами можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни недели с 8 до 17 часов.

Контактные телефоны организатора аукциона для уточнения или получения дополнительной информации: г. Могилев (0222) 22 21 78, 22 00 89.

РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «БЕЛОВЕЖСКИЙ»

Номер лота	ЛОТ № 1	ЛОТ № 2
Наименование объекта	• Капитальное строение (инв. № 125/С-14895), общ. пл. 336,6 кв.м, склад. • Капитальное строение (инв. № 125/С-14896), общ. пл. 1482,3 кв.м, молочно-товарная ферма. • Капитальное строение (инв. № 125/С-14892), общ. пл 57,4 кв.м, здание молочного блока. • Капитальное строение (инв. № 125/С-14902), артскважина. • Капитальное строение (инв. № 125/С-14900), водонапорная башня. • Капитальное строение (инв. № 125/С-14893), общ. пл. 12,3 кв.м, здание пультовой.	• Капитальное строение (инв. № 125/С-14904), общ. пл. 2 157,9 кв.м, склад. • Капитальное строение (инв. № 125/С-14903), общ. пл. 1745,8 кв.м, молочно-товарная ферма. • Капитальное строение (инв. № 125/С-14905), общ. пл 397,3 кв.м, конюшня. • Капитальное строение (инв. № 125/С-14908), артскважина. • Капитальное строение (инв. № 125/С-14907), водонапорная башня. • Капитальное строение (инв. № 125 С-14906), общ. пл. 17,4 кв.м, здание пультовой.
Место-нахождение объекта	Брестская область, Каменецкий р-н, Ясненский с/с, 7, южнее дер. Оберовщина, примыкающие к деревне Мыкшицы	Брестская область, Каменецкий р-н, Ясненский с/с, 9, примыкающий к деревням Тумин, Лумна и Бордзевка
Начальная цена продажи, руб. без НДС	160 276 000	319 958 000
Размер задатка, руб.	16 027 600	31 995 800
Право на земельный участок	Право постоянного пользования После продажи объекта с аукционных торгов границы земельного участка будут уточняться путем выполнения комплекса топогеодезических работ	Право постоянного пользования После продажи объекта с аукционных торгов границы земельного участка будут уточняться путем выполнения комплекса
Условия продажи	без условий	без условий
Продавец (Балансо-держатель)	ОАО «Беловежский»	
Организатор торгов	РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление	
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов	
Условия оплаты	Оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи	
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012105618108 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 369, УНП 102353509	

Аукцион состоится 19 апреля 2013 г. в 11.00
по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325 Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

Для участия в аукционе необходимо предоставить:
1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
* Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 20% от продажной цены объекта, стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов, комиссионное вознаграждение Поверенному.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:
г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.
Последний день приема заявлений – 18 апреля 2013 г. до 17.00.
Контактный тел.: 8 (0162) 23 92 59, 21 88 81.

ДАПАМОГА Ў ГОРЫ І Ў РАДАСЦІ

Лепшыя кіраўнікі, адзначаныя сёлета Рагачоўскай раённай прафсаюзнай арганізацыяй работнікаў адукацыі і навукі: дырэктар гімназіі Г.А. Рубісава, загадчыца дзіцячага садка №12 Я.А.Раманава, дырэктар Гарадзецкай дапаможнай школы-інтэрната Т.А. Аніськова і дырэктар Гарадзецкай сярэдняй школы С.Ф. Ткачова.

— Аддаваць належнае чалавеку працы — гэта для нас самае галоўнае, — адзначае Наталля Давыдзенка, намеснік старшыні Гомельскага абласнога камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. — Вось і ў Рагачоўскім раёне мы адзначылі самых лепшых у прафесіі. Ну а арганізацыя прафсаюзаў тут сапраўды асабліва. Дарэчы, яна па выніках мінулага года стала лепшай у вобласці.

У зале — амаль адны жанчыны. Менавіта яны пры падтрымцы рэдкіх педагогаў-мужчын і робяць штодзённую, карпатлівую працу настаўніка творчай. Зарплаты ў педагогаў не надта вялікія. А таму лішні клопат з боку наймальніка і прафсаюза ў выглядзе дадатковай прэміі ім не перашкодзіць. Начальнік аддзела адукацыі Рагачоўскага раёна Пётр Гузелевіч гаворыць, што сустрэчы такія — разам з прафсаюзамі — у іх раёне сталі традыцыйнымі:

— Зразумела, усе нашы дасягненні — вынік працы не аднаго чалавека, а ўсёй сістэмы. Таму мы не першы год урачыста збіраем не толькі людзей, якія выкладаюць, але і ўвогуле ўсіх, хто забяспечвае навучальны працэс: прыбіральшчыц, дворнікаў, кухараў, кіраўнікоў...

Некалькі гадоў таму ўпраўленнем адукацыі Гомельскага аблвыканкама сумесна з Гомельскім абкамам прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі быў арганізаваны конкурс на лепшую работу аддзелаў адукацыі і райкамаў прафсаюза па стварэнні ўмоў для творчай працы, умацаванні здароўя і адпачынку працаўнікоў. Журы конкурсу цікавілася, наколькі камфортна працуецца педагогам, як ацэньваецца іх праца, якія меры стымулявання ўжывае кіраўніцтва, ці гатова яно прыйсці на дапамогу работніку, калі гэта неабходна. Асаблівую ўвагу выклікалі прыклады мэтанакіраванага клопату пра чалавека. Такія, як аказанне матэрыяльнай дапамогі членам прафсаюза ў цяжкіх жыццёвых умовах. Вось тут рагачоўцы асабліва вызначыліся. Як расказвае старшыня Рагачоўскай раённай прафсаюзнай арганізацыі Валянціна Максіменка, у іх раёне створаны і дзейнічаюць два фонды, здольныя падтрымаць у складаных абставінах. Размова пра фонд матэрыяльнай дапамогі пацярпелым ад стыхійных бедстваў і рытуальны. Першы аказвае матэрыяльную дапамогу работнікам у выпадку пажару, паводкі, урагану і іншых няшчасцяў, калі прычыняецца значная матэрыяльная шкода кватэрам і дамам, у якіх пражываюць людзі. Палажэнне аб фондзе матэрыяльнай дапамогі пацярпелым ад стыхійных бедстваў работнікам адукацыі ў Рагачоўскім райкаме дзейнічае больш за 20 гадоў. За гэты час прафсаюз дапамог пражыць гора не адной сям'і. За апошнія 5 гадоў такая дапамога была запатрабавана 7 разоў:

— Сярод тых, хто пацярпеў ад пажару — шматдзетная сям'я кухара навучальна-педагагічнага комплексу «Старасельскі дзіцячы садок — сярэдняя школа» Ірыны Байло, у якой у 2011 годзе згарэў дом. Ім самім было б складана наноў адбудавацца. А дзякуючы гэтаму фонду больш чым Br30 млн мы выплацілі і купілі ёй за гэтыя грошы дом у вёсцы Старое Сяло. І такіх прыкладаў у нас шмат. Летась Алене Пумпулявай, загадчыцы Званецкага дзіцячага садка, таксама на рамонт у доме пасля пажару было выдаткавана каля Br20 млн. Вось ляжаць дакументы яшчэ на адну пацярпелую ад стыхійнага бедства — Марыю Цемніка-ву з вёскі Азяраны. Таксама абавязкова акажам дапамогу. Што тычыцца рытуальнага фонду, ён існуе ў раёне больш за 15 гадоў. У выпадку смерці мы выплачваем Br9 млн 240 тысяч. За мінулы год 21 сям'я атрымала такую дапамогу. І тут мы працуем сумесна з аддзелам адукацыі. Людзі вельмі адказна ўносяць грошы ў гэты фонд. Акрамя таго, мы распрацавалі палажэнне аб аказанні матэрыяльнай дапамогі менавіта праз райкам прафсаюзаў. У нас паменшылі адлічэнні на абласную арганізацыю, затое мы сталі часцей прэміраваць, узнагароджваць сваіх актывістаў і аказваць матэрыяльную дапамогу — на пуцёўкі, на лекі тым, хто хварэе... Многія педагогі вучаць сваіх дзяцей на платнай аснове — ім мы таксама аказваем матэрыяльную дапамогу. Не забываем і сваіх ветэранаў.

Сацыяльнае партнёрства з аддзелам адукацыі для Рагачоўскай раённай прафсаюзнай арганізацыі — звычайная справа. Дзякуючы яму атрымліваецца арганізоўваць паездкі дзяцей на навагоднюю ёлку ў Мінск. Штогод адбываецца і экскурсія ў Белавежскую пушчу. Дзеці наведваюць не толькі ўсе цыркавыя прадстаўленні ў Гомелі, але і лепшыя спектаклі ў тэатрах сталіцы краіны. Пры гэтым калі кошт білетаў аплачвае прафсаюз, транспарт выдзяляе аддзел адукацыі Рагачоўскага райвыканкама. Урэшце даплаціць застаецца ўсяго каля 30 тысяч на чалавека.

— Гомельскі абкам прафсаюза за першае месца ўзнагародзіў нас прэміяй у памеры 12 млн рублёў, — працягвае Валянціна Аркадзьеўна, — мы прынялі рашэнне за гэтыя сродкі арганізаваць у маі калектыўную экскурсію для прафсаюзнага актыву — у Мір і Нясвіж.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

Гродзенскі тыдзень моды

З 12 па 17 сакавіка ў рамках праекта «Жывая гісторыя», які ажыццяўляецца моладдзю ГрДУ імя Янкі Купалы пры падтрымцы мясцовых улад, у горадзе над Нёманам праходзіць Гродзенскі тыдзень моды.

У вітрынах гандлёвага дома «Нёман» можна ўбачыць ілюстрацыі гістарычнай моды, якія прадаставілі Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей, а таксама калекцыянеры Януш Паруліс і Аляксандр Сявенка. З лекцыяй аб гісторыі моды Гродзеншчыны выступіць выкладчык па канструяванні і мадэляванні адзення, гісторыі стыляў у касцюме Гродзенскага каледжа лёгкай прамысловасці Алена Бяляева. А ў моладзевым цэнтры адбудзецца паказ калекцый адзення ад прадпрыемстваў вобласці і навучальных установ горада. Пры гэтым спецыяльна пашылі гістарычнае ўбранне розных эпох. Акрамя таго, сваё майстэрства прадэманструюць цырульнікі і візажысты.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Самыя прыгожыя з жанчын

Старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Барыс Батура ўручыў ордэн Маці 23 жанчынам, якія нарадзілі і дастойна выхоўваюць пяць і больш дзяцей.

Гэта сапраўды гераічныя жанчыны. У той час, калі разбураюцца сямейныя традыцыі, а ў грамадстве квітнее эгаізм і спажыванне дзеля асабістага камфорту, яны ўзялі на сябе цяжкі абавязак па выхаванні дзяцей. «Быць шматдзетнай маці — не меншая заслуга, чым з'яўляцца перадавіком вытворчасці, знакамітым вучоным ці народным артыстам. Ні адзін чалавек не можа стаць годным грамадзянінам, калі ён дрэнна выхаваны. А самае якаснае выхаванне, заснаванае на павазе да бліжняга, шчодрасці і ўзаемадапамозе, адказнасці перад бацькамі, сёстрамі і братамі, даецца менавіта ў моцных шматдзетных сем'ях», — упэўнены губернатар.

З хваляваннем прымалі жанчыны высокую ўзнагароду. Яны такія розныя і, разам з тым, падобныя, бо працуюць маці. Ніна Дзяхцяр з Клецкага раёна выхоўвае шасцярых дзяцей, столькі ж і ў Марыны Дробыш са Слуцкага раёна. А Ала Ходар з Нясвіжчыны гадуе семярых малых. Бясспрэчна, нялёгка ім спраўляцца з хатнімі клопатамі, але, як адзначаюць яны самі, гэта клопаты прыемныя. Тым больш што побач муж і старэйшыя дзеці, якія заўсёды падставяць плячо. І, вядома, маці дзякуюць за падтрымку дзяржаве.

У рэспубліцы створана даволі моцная заканадаўчая база, якая дапамагае вырашаць іх праблемы. Гэта і дапамога па доглядзе дзяцей, і бясплатнае медыцынскае абслугоўванне, і будаўніцтва льготнага жылля. Толькі за мінулы год 1495 шматдзетных сем'яў атрымалі льготныя крэдыты на ўзвядзенне (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў на суму 176,1 млрд рублёў. Фінансавая дапамога дзяржавы ў пагашэнні запазычанасці па крэдытах склада 13,2 млрд рублёў. Летась у цэнтральным рэгіёне дзяржаўная дапамога выплачана сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, на суму 527,8 млрд рублёў.

У Мінскай вобласці пражывае 10180 шматдзетных сем'яў, ордэна Маці ўдастоены 1359 жанчын. Пачынаючы з 2006 года, ім выплачваецца грашовая сума ў памеры пяцікратнага зацверджанага бюджэту пражыткавага мінімуму.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

МАЛПАЛЭНД: вяровачны гарадок для ўсіх!

Падвесныя бярвенні, вісячыя масты, спуск на роліку — спартыўна-турыстычная паласа з нестандартнымі этапамі адрэналін-парка «Малпалэнд», што непадалёку ад хутара Арлоўшчына Валожынскага раёна, прадугледжвае пошук удзельнікамі арыгінальных рашэнняў па пераадоленні этапаў. На вышыні ад 5 да 8 метраў над зямлёй смелыя і вынослівыя ўдзельнікі імкнуцца пераадолець усе перашкоды, каб навучыцца валодаць сабой і сваімі пачуццямі, перамагчы страх, палепшыць спрыт і каардынацыю, агульную спартыўную падрыхтоўку і проста атрымаць задавальненне. Сюды прыязджаюць не толькі дарослыя, але і дзеці, для якіх прадугледжана спецыяльная траса — у адным метры над зямлёй.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

Валожынскі раён.

Анталогія беларускага верша пра каханне

Песняй вясны лебядзінаю...

Вядучы Алесь Каско

Неўміручасць пачуцця

Каханне — адзін з самых даўніх і, несумненна, вечных матываў паэзіі, таму такая багатая ў сваёй колькасці ды разнастайнасці і наша, айчынная, інтымная лірыка. За малым выключэннем, вершы пра каханне пісалі і пішуць усе творцы, а што да паэтак, дык тут без выключэнняў наогул: нават у Цёткі, чые творы на мяжы XIX—XX ст. ст. распаўсюджваліся як рэвалюцыйныя пракламацыі, «пракідаюцца» радкі пра дзявочую красу і цноту...

Шчодрая на інтымную лірыку муза сучаснай паэткі Валянціны Аколавай; у яе ёсць цэлыя цыклы на гэтую вечную тэму. Скажам, «Вершы адной вясны». Самы яркі з іх, на думку складальніка звяздоўскай анталогіі, падаецца ніжэй. Ён пра неўміручасць кахання і любові, як бы пачуцці ні зацярушваліся і неўмольным часам, і бяс-страсным сусветам.

Валянціна АКОЛАВА

❍ ❍ ❍

А ўжо ні здагадак,
ні лёсу загадак
Я больш не шукаю,
мой першы каханак.
Раскрылена доля.
Чужая сваволя
Мяне не палохае
ласкай і воляй.
Над вечнасцю
рукі свае прасцінаю.
Душа ад кахання глыбее —
я знаю.
І ўсё ж, калі снег
зацярушыць над полем,
Вянчаюцца з радасцю
смутак і боль мой.
І белай зімы твар
вясельна-дзявочы
Шукае ў сусвеце твае,
любы, вочы...

■ Жыць здаровым

ШТО НА СТОЛ, А ШТО ПАД СТОЛ

або Што перашкаджае беларусам правільна харчавацца?

Медыкі сцвярджаюць: нармальны ціск і апетыт да жыцця шмат у чым залежаць ад нашай ежы

Наталля Сыравегіна цалкам змяніла сваё харчаванне.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Нас не шкадуюць хваробы. Каля 5 беларусаў са ста пакутуюць на касцёва-мышачныя захворванні, 3 — на сардэчна-сасудзістыя, 1 — на анкалагічныя. У Мінску наогул кожны 40-ы гараджанін мае анкалагічны дыягназ.

Медыкі кажуць, што многія нашы праблемы — ад няправільнага харчавання. І раяць не забываць, што ў першую чаргу за сваім здароўем павінен сачыць сам чалавек.

Але тут паўстае яшчэ адно пытанне. Як правіла, большасць з нас 8 гадзін на дзень праводзяць на працы. Ці магчыма арганізаваць правільнае і здаровае харчаванне ва ўмовах працоўнага дня? Давайце паглядзім...

«Нядаўна муж сказаў: не гатуй мне мяса, я буду есці тое ж, што і ты»

Крыху больш за год таму дактары вынеслі **Наталлі СЫРАВЕГІНАЙ** страшны вердыкт: рак. У кастрычніку 2011 года ёй зрабілі аперацыю, і з тых часоў яна мужна змагаецца з хваробай. І здавацца не збіраецца. Больш за тое, сёння гэтая мініяцюрная жанчына, якая надзіва молада выглядае, не лічыць сябе хворай.

Яна расказвае, што пасля бальніцы цалкам змяніла сваё харчаванне. Выключыла ўсе прадукты, якія змяшчаюць канцэрагенныя рэчывы: вяндліну, саленні, марынады, кансервы, маргарын. Сочыць за тым, каб на стол не траплялі зацвілыя прадукты. Перастала смажыць, выкарыстоўваць фрыцюр і грыль. Стала есці больш крыжакветнай агародніны, соевых прадуктаў, уключыла ў рацыён зялёны чай, прарошчаную пшаніцу, насенне лёну, нерафінаваны аліўкавы і льняны алей. Ігнаруе белы пшанічны хлеб, стала сама выпякаць хлеб без дражджэй і хімічных дабавак. Замест іх дадае насенне лёну, сланечніку, гарбузоў, арэхі, кунжут, кмен і вотруб'е.

«Хлебапечкі ў мяне няма, выкарыстоўваю звычайную духоўку, — кажа Наталля. — Цяпер гэта так захапіла мяне, што стала своеасаблівым хобі. Знаходжу розныя рэцэпты ў інтэрнэце, увасабляю іх у жыццё... Хоць не заўсёды ёсць на гэта час, і хлеб я не пяку кожны дзень».

«Спачатку былі сумненні: ці змагу перабудавацца, пазбавіць сябе звыклых рэчаў? — успамінае мая суразмоўца. — Але мне вельмі хацелася ачуняць. Я чытала: каб выпрацаваліся новыя харчовыя звычкі, трэба ў сярэднім 6 месяцаў. Гэта аказалася праўдай. Прыблізна праз гэты час мне стала, напрыклад, нецікава і нясмачна есці салёную ежу. Проста ўжо прывыкла да іншага. І калі дома гатую — не салю ежу, а прапаную хатнім падсаліць самім на смак. І заўважаю, што яны робяць гэта ўсё радзей і радзей. Нядаўна муж сказаў: не гатуй мне мяса, я буду есці тое ж, што і ты. Так што галоўнае — пачаць»...

«Спачатку думала, што ў жыцці будзе шмат абмежаванняў. Але, як аказалася, жыць можна!»

Што такое правільнае харчаванне, мы ведаем. А вось як арганізаваць яго і не стаць пры гэтым закладнікамі кухні?

Зноў звернемся да вопыту Наталлі Сыравегінай, які тым больш цікавы, што яе харчаванне моцна адрозніваецца ад харчавання сярэднестатыстычнага беларуса, і пры гэтым яна не выглядае занадта заклапочанай або зацыкленай на ім, вядзе звыклы лад жыцця і не прастойвае гадзінамі ля пліты.

«Я гатую ежу сама і толькі на адзін прыём, каб не разаграваць. Раніцай я не паспяваю паесці дома, таму бяру ссабойку і снедаю на працы, — кажа Наташа. — Звычайна гэта творог з вотруб'ем, прарошчанай пшаніцай, насеннем лёну, змолатым на кавамолцы. Або як варыянт — купляю шматкі 4 відаў і на працы заліваю цёплай вадой. Магу дадаць туды арэхі, чайную лыжку мёду, насенне лёну. Атрымліваецца «жывая» кашка».

Абедаць Наташа ходзіць у сталовую. Працуе яна на «Атланце», які славіцца добрай арганізацыяй харчавання сваіх работнікаў. Хоць Наталлі з яе дыетай усё ж не зусім камфортна і там.

«У нас вялікі выбар абедзеннага меню, ёсць дыетычная раздача, — кажа яна. — Страў шмат, але я ў асноўным бяру салату, часам дзве салаты, і калі няма рыбы, то штонебудзь тварожнае. Магу ўзяць кашу, якая ў меню ідзе як гарнір.

Увечары дома Наталля гатуе вячэру сабе і сваёй сям'і. Часам усе ядуць адно і тое ж, часам не. «Сям'і магу прыгатаваць мяса з кашай на гарнір, мне будзе каша. Ці гатую рыбу — на пары або запечаную ў духоўцы. Нярэдка выкарыстоўваю замарожаную гародніну. Абавязковы элемент — салата. А калі я прыходжу позна, мая сям'я гатуе мне па маіх рэцэптах (Наталля вядзе актыўны лад жыцця, займаецца ёгай, танцамі. — **Аўт**.).

Урадам зацверджана сістэма дзяржаўных сацыяльных стандартаў. Так, да канца 2015 года на 1000 жыхароў у гарадах павінна прыпадаць 40 месцаў агульнадаступных аб'ектаў грамадскага харчавання, у Мінску — 45 месцаў. Сёння гэты нарматыў па рэспубліцы складае 34,4 месца на 1000 чалавек.

— Часам я хаджу з сяброўкамі ў кавярню, — гаворыць яна. — Там заўсёды ёсць салаты, напрыклад, я люблю грэчаскую. Заўсёды можна замовіць рыбу. Часам дазваляю сабе і келіх чырвонага віна. Замаўляю зялёную гарбату. У меню кожнай установы можна выбраць нешта, што табе падыходзіць...

Але тут жа дадае: «Хоць часта бывае воцат у салатах і, вядома, заўсёды соль»... А яшчэ прызнаецца: «Калі я толькі пачынала, усё здавалася складаным, думала, што ў жыцці будзе шмат дадатковых абмежаванняў. Але, як аказалася, усё можна арганізаваць. Я ўжо прылаўчылася да сваёй сістэмы харчавання.

Не кажыце, што нешта нясмачнае, пакуль не паспрабуеце

Дарэчы, у Мінску 4 лютага ў рамках Сусветнага дня барацьбы супраць раку анкапацыенты з Мінска, Смаргоні, Рэчыцы, Гомеля, Бабруйска і Барысава сумесна з псіхолагамі, дыетолагамі і прадстаўнікамі СМІ правялі дыскусію аб харчаванні анкахворых.

На жаль, пакуль няма спецыялістаў, якія займаюцца менавіта анкадыеталогіяй. Дактары-анколагі ў вельмі рэдкіх выпадках даюць рэкамендацыі па дыетычным харчаванні. Акрамя таго, сёння прадстаўлена мноства супярэчлівай інфармацыі, у аснове якой не апошнюю ролю адыгрывае камерцыйны інтарэс.

Таму вырашылі звярнуцца ў Міністэрства аховы здароўя Беларусі, РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі ім. Н. М. Аляксандрава з прапановай паскорыць распрацоўку навуковых абгрунтаванняў асноў дыетычнага харчавання для анкапацыентаў. Акрамя таго, удзельнікі дыскусіі плануюць звярнуцца ў арганізацыі грамадскага харчавання з прапановай пашырыць асартымент меню, уключыўшы ў яго стравы, дружалюбныя да людзей з анкалагічным дыягназам.

Удзельнікі дыскусіі прадэгуставалі такія стравы ў клубе-кавярні «Рэбус», якая правяла эксперымент па іх гатаванні (пад кіраўніцтвам дыетолага-практыка Марыны Мацаль). І тут немагчыма ўтрымацца, каб не падзяліцца асабістымі ўражаннямі, таму што повары-майстры разбілі шматлікія міфы. Напрыклад, пра тое, што такая ежа нясмачная, прэсная, што яна патрабуе доўгага гатавання і жыццё з такім харчаваннем будзе тужлівым. Дык вось — не, не і не! Кажу з уласнага вопыту. Да гэтай дэгустацыі я не ўяўляла, як можна есці без солі. Аказалася, можна. Паспытала суп з фасолі і сачавіцы, амлет з цыбуляй (нясмажаны), творог з чарнаслівам, галубцы з агародніны, жульен. Усё гэта было несалёным, несалодкім і без перцу. І пры гэтым — смачным! Мне нават не давялося карыстацца соевым соусам, які паслужліва паставілі на ўсякі выпадак. Таму што, аказваецца, існуе мноства карысных і даступных прыпраў, існуе гульня смаку розных кампанентаў, здольная замяніць звыклую нам соль. І пры жаданні быць здаровым, а таксама творчым падыходзе да гатавання ежы цалкам рэальна харчавацца правільна і пры гэтым смачна.

Святлана БУСЬКО.

КАМЕНТАРЫЙ

Дапамагчы арганізаваць харчаванне на прадпрыемстве павінны прафсаюзы

Медыкі сцвярджаюць, што з дапамогай правільна падабранай дыеты можна наладзіць работу печані, сардэчна-сасудзістай сістэмы, знізіць вагу, узровень халестэрыну і цукру ў крыві. Вось толькі знайсці для сябе патрэбную ежу ва ўстановах беларускага грамадскага харчавання, напрыклад, тым жа вегетарыянцам не зусім проста.

Па каментар я звярнулася да **выканаўцы абавязкаў начальніка аддзела арганізацыі грамадскага харчавання Міністэрства гандлю Беларусі Ларысы КАМАРОВАЙ.**

— Сёння ўпор ідзе ў асноўным на арганізацыю правільнага харчавання ў навучальных установах (у школе, ліцэях, каледжах) і на вытворчых прадпрыемствах.

У прыватнасці, на прадпрыемстве з гэтым павінны працаваць прафсаюзы, а таксама кіраўніцтва. У сваю чаргу, кіраўнікі аб'ектаў грамадскага харчавання і загадчыкі вытворчасці сочаць, каб пры складанні меню ў яго абавязкова ўключаліся лёгкія стравы. Пад лёгкімі стравамі мы маем на ўвазе такія, у саставе якіх адсутнічаюць кампаненты, што раздражняюць тыя ці іншыя органы (напрыклад, гарчыца, хрэн, воцат). І прыгатаваны яны павінны быць з дапамогай варкі, тушэння, варкі на пары. Такая ежа, па сутнасці, карысная ўсім без выключэння. У меню таксама павінны абавязкова ўключацца малочныя, кісламалочныя прадукты, гародніна, садавіна.

Лёгкія стравы маюцца ў меню любой сталовай. Напрыклад, малочны суп, у якім няма тлушчу, пасераванай гародніны. І, як правіла, у любой сталовай у штодзённым меню ёсць адварныя стравы... Гэта ў нашым грамадскім харчаванні ўжо выпрацавана гадамі.

Дарэчы, нядаўна ўступіла ў сілу пастанова Савета Міністраў № 1190, згодна з якой уведзены новы сацыяльны стандарт, які тычыцца арганізацыі харчавання на працоўных месцах.

Так, калі на прадпрыемстве працуе больш за 200 чалавек у адну змену, то на ім абавязкова павінен быць аб'ект грамадскага харчавання (сталовая, буфет і г.д.). У іншых выпадках прадпрыемства павінна арганізоўваць харчаванне сваіх работнікаў, напрыклад, склаўшы дагавор з бліжэйшым аб'ектам грамадскага харчавання. І калі прадпрыемства зацікаўлена ў здароўі сваіх работнікаў, яно можа агаварыць наяўнасць у меню дыетычных страў. Да вырашэння гэтага пытання, зноў жа, павінны далучыцца і прафсаюзы.

Калі ў арганізацыі малая колькасць работнікаў, павінен быць у наяўнасці пакой прыёму ежы, дзе неабходна прадугледзець месца для яе разагравання, халадзільнік, чайнік, адпаведную мэблю.

❑❑❑

Так што, як бачыце, прыняты адпаведныя стандарты, якія датычацца харчавання на працоўных месцах. Справа за малым — прымусіць іх працаваць.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Падаткі на тлустую, салёную і салодкую ежу

Дарэчы, шмат у якіх краінах даўно ўжо ўведзены павышаныя падаткі або іншыя абмежаванні для шкоднай ежы. Так, у ЗША павышаныя падаткі на фаст-фуд і салодкую газіроўку дзейнічаюць у некалькіх штатах, а мясцовыя палітыкі абмяркоўваюць іх распаўсюджванне на ўсю тэрыторыю краіны.

Падатак на салодкія газаваныя напоі з 2012 года таксама ўвяла Францыя. У Венгрыі «падатак на чыпсы», які празвалі яго грамадзяне краіны, пачаў дзейнічаць з 2011 года. Яшчэ адна разнавіднасць падатку на junk food дзейнічае ў Фінляндыі, дзе з 2011 года адмысловым зборам абкладзены прысмакі. Кіраўнік групы экспертаў ААН па праблемах харчавання Аліўе дэ Шутэр заклікае індустрыяльныя краіны ўводзіць падаткі на тлустую, салёную і салодкую ежу, у прыватнасці, на яго думку, падаткамі ў першую чаргу павінны абкладацца гамбургеры, газіроўка і чыпсы.

Дарэчы, гэта не адзіны спосаб барацьбы са шкоднай ежай: у лістападзе мінулага года Канадская медыцынская асацыяцыя прапанавала размяшчаць на ўпакоўках са шкоднымі прадуктамі застрашальныя надпісы, як гэта ўжо робяць з цыгарэтамі. Напрыклад, на каробках з піцай прапанавана паказваць хворую печань. ■

ОАО «ЦентроСтройОфис»

Учетный номер плательщика	191303207
Вид экономической деятельности	операции с недвижимым имуществом
Организационно-правовая форма	
Орган управления	
Единица измерения	млн. руб.
Адрес	220019, г. Минск, ул. Монтажников, 39, офис 208

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 31 декабря 2012 г.

АКТИВЫ	Код строки	на 31 декабря 2012 г.	на 31 декабря 2011 г.
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства:	110	1 522	1 086
Нематериальные активы:	120		
Доходные вложения в материальные активы	130		
в том числе:			
инвестиционная недвижимость	131		
предметы финансовой аренды (лизинга)	132		
прочие доходные вложения в материальные активы	133		
Вложения в долгосрочные активы	140		
Долгосрочные финансовые вложения	150		
Отложенные налоговые активы	160		
Долгосрочная дебиторская задолженность	170		
Прочие долгосрочные активы	180		
ИТОГО по разделу I	190	1 522	1 086
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	11	7
в том числе:			
материалы	211	11	7
животные на выращивании и откорме	212		
незавершенное производство	213		
готовая продукция и товары	214		
товары отгруженные	215		
прочие запасы	216		
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220		
Расходы будущих периодов	230		1
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240		
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	297	120
Краткосрочные финансовые вложения	260	380	400
Денежные средства и их эквиваленты	270	72	36
Прочие краткосрочные активы	280		
ИТОГО по разделу II	290	760	564
БАЛАНС (190+290)	300	2 282	1 650

СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	Код строки	на 31 декабря 2012 г.	на 31 декабря 2011 г.
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	459	459
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	-	-
Добавочный капитал	450	1 089	638
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	646	479
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	-	-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	490	2 194	1 576
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	-	-
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу IV	590	-	-
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	-	-
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	-	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	88	74
в том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	1	-
по авансам полученным	632	1	4
по налогам и сборам	633	26	20
по социальному страхованию и обеспечению	634	9	8
по оплате труда	635	37	42
по лизинговым платежам	636	-	-
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	-	-
прочим кредиторам	638	14	-
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	-	-
Резервы предстоящих платежей	660	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	-	-
ИТОГО по разделу V	690	88	74
БАЛАНС (490+590+690)	700	2 282	1 650

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
в период с 1 января по 31 декабря 2012 г.

Наименование показателей	Код строки	за 2012 г.	за 2011 г.
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	876	551
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	-	496
Валовая прибыль (010-020)	030	876	55
Управленческие расходы	040	771	-
Расходы на реализацию	050	-	-
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050)	060	105	55
Прочие доходы по текущей деятельности	070	5	-
Прочие расходы по текущей деятельности	080	15	20
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (+-060+070-080)	090	95	35
Доходы по инвестиционной деятельности	100	72	424
в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	-	403
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	-	-
проценты к получению	103	72	21
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	-	-
Расходы по инвестиционной деятельности	110	-	48
в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	-	48
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	-	-
Доходы по финансовой деятельности	120	-	-
в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	-	-
прочие доходы по финансовой деятельности	122	-	-
Расходы по финансовой деятельности	130	-	-
в том числе: проценты к уплате	131	-	-
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	-	-
прочие расходы по финансовой деятельности	133	-	-
Иные доходы и расходы	140	-	-
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100-110+120-130+-140)	150	72	376
Прибыль (убыток) до налогообложения (+-090+-150)	160	167	411
Налог на прибыль	170	-	-
Изменение отложенных налоговых активов	180	-	-
Изменение отложенных налоговых обязательств	190	-	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	-	-
Чистая прибыль (убыток) (+-160-170+-180+-190-200)	210	167	411
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	450	586
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток) (+-210+-220+-230)	240	617	997
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	-	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

Руководитель **Ребенок Т.Н.**
Главный бухгалтер **Михальчик Л.Н.**
27 февраля 2013 г.

ОАО «ЭнКоСтрой»

Учетный номер плательщика	191303197
Вид экономической деятельности	Операции с недвижимым имуществом
Организационно-правовая форма	
Орган управления	
Единица измерения	млн. руб.
Адрес	220019, г. Минск, ул. Монтажников, 39, офис 201

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 31 декабря 2012 г.

АКТИВЫ	Код строки	на 31 декабря 2012 г.	на 31 декабря 2011 г.
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства:	110	5 936	5 529
Нематериальные активы:	120		
Доходные вложения в материальные активы	130		
в том числе:			
инвестиционная недвижимость	131		
предметы финансовой аренды (лизинга)	132		
прочие доходные вложения в материальные активы	133		
Вложения в долгосрочные активы	140		
Долгосрочные финансовые вложения	150	4 988	
Отложенные налоговые активы	160		
Долгосрочная дебиторская задолженность	170		
Прочие долгосрочные активы	180		
ИТОГО по разделу I	190	10 924	5 529
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	9	21
в том числе:			
материалы	211	9	21
животные на выращивании и откорме	212		
незавершенное производство	213		
готовая продукция и товары	214		
товары отгруженные	215		
прочие запасы	216		
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220		
Расходы будущих периодов	230	2	
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240		
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	686	372
Краткосрочные финансовые вложения	260	75	1 330
Денежные средства и их эквиваленты	270	267	109
Прочие краткосрочные активы	280		
ИТОГО по разделу II	290	1 039	1 832
БАЛАНС (190+290)	300	11 963	7 361

СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	Код строки	на 31 декабря 2012 г.	на 31 декабря 2011 г.
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	4 591	2 908
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	-	-
Добавочный капитал	450	3 156	3 021
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	3 913	1 223
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	-	-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	490	11 660	7 152
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	-	-
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу IV	590	-	-
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	-	-
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	-	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	303	209
в том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	3	-
по авансам полученным	632	47	2
по налогам и сборам	633	133	127
по социальному страхованию и обеспечению	634	11	11
по оплате труда	635	92	69
по лизинговым платежам	636	-	-
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	-	-
прочим кредиторам	638	17	-
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	-	-
Резервы предстоящих платежей	660	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	-	-
ИТОГО по разделу V	690	303	209
БАЛАНС (490+590+690)	700	11 963	7 361

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
в период с 1 января по 31 декабря 2012 г.

Наименование показателей	Код строки	за 2012 г.	за 2011 г.
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	1 751	1 256
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	185	903
Валовая прибыль (010-020)	030	1 566	353
Управленческие расходы	040	1 482	
Расходы на реализацию	050	-	
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050)	060	84	353
Прочие доходы по текущей деятельности	070	41	18
Прочие расходы по текущей деятельности	080	22	22
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (+-060+070-080)	090	103	349
Доходы по инвестиционной деятельности	100	3 957	99
в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	3 795	-
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	-	-
проценты к получению	103	162	99
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	-	-
Расходы по инвестиционной деятельности	110	1 370	-
в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	1 370	-
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	-	-
Доходы по финансовой деятельности	120	-	-
в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	-	-
прочие доходы по финансовой деятельности	122	-	-
Расходы по финансовой деятельности	130	-	-
в том числе: проценты к уплате	131	-	-
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	-	-
прочие расходы по финансовой деятельности	133	-	-
Иные доходы и расходы	140	-	-
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100-110+120-130+-140)	150	2 587	99
Прибыль (убыток) до налогообложения (+-090+-150)	160	2 690	448
Налог на прибыль	170	-	-
Изменение отложенных налоговых активов	180	-	-
Изменение отложенных налоговых обязательств	190	-	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	-	-
Чистая прибыль (убыток) (+-160-170+-180+-190-200)	210	2 690	448
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	1 818	2 722
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток) (+-210+-220+-230)	240	4 508	3 170
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	-	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

Руководитель **Ратникова Г.В.**
Главный бухгалтер **Михальчик Л.Н.**
26 февраля 2013 г.

ОАО «Минскэнергострой»

Учетный номер плательщика	100008291
Вид экономической деятельности	строительство
Организационно-правовая форма	
Орган управления	
Единица измерения	млн. руб.
Адрес	220019, г. Минск, ул. Монтажников, 39

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 31 декабря 2012 г.

АКТИВЫ	Код строки	на 31 декабря 2012 г.	на 31 декабря 2011 г.
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства:	110	2 341	1 454
Нематериальные активы:	120	1	1
Доходные вложения в материальные активы	130		
в том числе:			
инвестиционная недвижимость	131		
предметы финансовой аренды (лизинга)	132		
прочие доходные вложения в материальные активы	133		
Вложения в долгосрочные активы	140		
Долгосрочные финансовые вложения	150	996	
Отложенные налоговые активы	160		
Долгосрочная дебиторская задолженность	170		
Прочие долгосрочные активы	180		
ИТОГО по разделу I	190	3 338	1 455
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	504	431
в том числе:			
материалы	211	226	196
животные на выращивании и откорме	212		
незавершенное производство	213	103	103
готовая продукция и товары	214	175	132
товары отгруженные	215		
прочие запасы	216		
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220		
Расходы будущих периодов	230	85	63
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	50	26
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	1 643	1 350
Краткосрочные финансовые вложения	260		477
Денежные средства и их эквиваленты	270	570	444
Прочие краткосрочные активы	280	151	151
ИТОГО по разделу II	290	3 003	2 942
БАЛАНС (190+290)	300	6 341	4 397

СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	Код строки	на 31 декабря 2012 г.	на 31 декабря 2011 г.
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	1 262	1 262
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	-	-
Добавочный капитал	450	2 949	2 381
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	-202	-569
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	-	-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	490	4 009	3 074
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	-	-
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	10	-
Доходы будущих периодов	540	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу IV	590	10	-
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	-	-
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	-	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	2 322	1 323
в том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	1 221	232
по авансам полученным	632	309	392
по налогам и сборам	633	222	239
по социальному страхованию и обеспечению	634	47	38
по оплате труда	635	211	197
по лизинговым платежам	636	296	210
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	3	3
прочим кредиторам	638	13	12
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	-	-
Резервы предстоящих платежей	660	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	-	-
ИТОГО по разделу V	690	2 322	1 323
БАЛАНС (490+590+690)	700	6 341	4 397

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
в период с 1 января по 31 декабря 2012 г.

Наименование показателей	Код строки	за 2012 г.	за 2011 г.
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	9 217	5 461
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	6 522	5 088
Валовая прибыль (010-020)	030	2 695	373
Управленческие расходы	040	2 333	-
Расходы на реализацию	050	-	-
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050)	060	362	373
Прочие доходы по текущей деятельности	070	142	36
Прочие расходы по текущей деятельности	080	200	90
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (+-060+070-080)	090	304	319
Доходы по инвестиционной деятельности	100	338	151
в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	176	151
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	-	-
проценты к получению	103	162	-
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	-	-
Расходы по инвестиционной деятельности	110	144	72
в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	140	72
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	4	-
Доходы по финансовой деятельности	120	-	-
в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	-	-
прочие доходы по финансовой деятельности	122	-	-
Расходы по финансовой деятельности	130	-	-
в том числе: проценты к уплате	131	-	-
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	21	-
прочие расходы по финансовой деятельности	133	-	-
Иные доходы и расходы	140		
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100-110+120-130+-140)	150	173	79
Прибыль (убыток) до налогообложения (+-090+-150)	160	477	398
Налог на прибыль	170	100	118
Изменение отложенных налоговых активов	180	-	-
Изменение отложенных налоговых обязательств	190	-10	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	-	-
Чистая прибыль (убыток) (+-160-170+-180+-190-200)	210	367	280
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	568	659
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток) (+-210+-220+-230)	240	935	939
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	-	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

Руководитель **Поболь Л.Н.**
Главный бухгалтер **Михальчик Л.Н.**
28 февраля 2013 г.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

(о проекте строительства помещения аптеки и помещения административного назначения в жилом доме № 2 (по генплану) в застройке микрорайона «Лошица–9»)

Информация о застройщике: Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, режим работы: понедельник –четверг – 8.30–17.30, пятница – 8.30–16.15, обед – 12.45–13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001 г.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 54 по ул. Матусевича
2. Жилой дом № 96 по ул. Нестерова
3. Жилой дом № 29 по ул. Казимировской

Информация о проекте строительства:

Цель проекта – строительство помещения аптеки и помещения административного назначения в составе многоквартирного жилого дома.

Начало строительства – сентябрь 2012 г., ввод в эксплуатацию – июнь 2013 г.

Положительное заключение государственной экспертизы № 256–15/12 от 11.05.2012 г.; № 650–15/12 от 24 августа 2012 г.

Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома – г. Минск, Ленинский район, жилой дом № 2 по генплану в застройке квартала «Лошица–9».

Характеристика объектов:

Объекты строительства – помещение аптеки общей площадью 178,93 м² и помещение административного назначения общей площадью 184,54 м², расположенные на первом этаже многоквартирного 10-этажного крупнопанельного жилого дома серии М–464–У1. Помещения строятся без выполнения в полном объеме подготовительных работ под отделку стен и потолков, а также без выполнения работ по внутренней отделке помещений (без наклейки обоев, покраски, облицовки), без покрытия полов, без встроенной мебели, без установки дверных блоков в межкомнатных перегородках, без установки санитарных приборов и оборудования (кроме унитаза и приборов учета воды).

Стены: наружные и межкомнатные перегородки – железобетонные панели.

Перекрытия – железобетонные.

Окна – из деревянного профиля со стеклопакетами.

Двери наружные – деревянные.

Отопление – центральное.

Электроснабжение – скрытая проводка.

Входы в помещения предусмотрены автономные, не связанные с жилой частью.

Проектно-сметной документацией предусмотрены в жилом доме: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, мусоропровод, лифт, лоджии, остекление лоджий.

Стоимость 1 м² общей площади объектов долевого строительства на дату опубликования проектной декларации:

– помещения аптеки – **14 800 000 руб.;**

– административного помещения – **15 480 000 руб.**

Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 770 от 15 марта 2012 г., свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 21 мая 2012 г. № 500/600–2120.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности:

крыши, технические этажи, подвалы, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Предполагаемый ввод дома в эксплуатацию – 2-й квартал 2013 г.

Строительство дома осуществляется застройщиком на основании решения Мингорисполкома № 770 от 15 марта 2012 г. собственными силами без заключения договоров подряда.

Порядок приема заявлений от лиц, желающих принять участие в долевом строительстве помещения:

Прием заявлений осуществляется отделом собственного строительства и инвестиций ОАО «МАПИД» (г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205а, кабинет №1, тел. 207 19 15) с 22 марта 2013 г., ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, понедельник–четверг с 9.00 до 17.00, обед с 12.45 до 13.30, в пятницу с 9.00 до 15.00, обед с 12.45 до 13.30.

Если лицо, желающее принять участие в долевом строительстве, в течение пяти календарных дней с момента регистрации его заявления не явилось для заключения договора и не сообщило об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и ОАО «МАПИД» оставляет за собой право заключить договор на строительство помещения с другим лицом.

О ходе работ по строительству можно узнать по телефонам отдела собственного строительства и инвестиций ОАО «МАПИД»: 207 19 15, 208 58 12, 207 16 73.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

(о проекте строительства помещения административного назначения в жилом доме № 1 (по генплану) в застройке микрорайона «Лошица–9»)

Информация о застройщике: Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, режим работы: понедельник –четверг – 8.30–17.30, пятница – 8.30–16.15, обед – 12.45–13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001 г.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 54 по ул. Матусевича
2. Жилой дом № 96 по ул. Нестерова
3. Жилой дом № 29 по ул. Казимировской

Информация о проекте строительства:

Цель проекта – строительство помещения административного назначения в составе многоквартирного жилого дома.

Начало строительства – июнь 2012 г., ввод в эксплуатацию – март 2013 г.

Положительное заключение государственной экспертизы № 148–15/12 от 05.04.2012 г.

Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома – г. Минск, Ленинский район, жилой дом № 1 по генплану в застройке квартала «Лошица–9».

Характеристика объектов:

Объект строительства – помещение административного назначения общей площадью 53,90 м², расположенное на первом этаже многоквартирного 10-этажного крупнопанельного жилого дома серии М–111–90 (БС–40). Помещение строится без выполнения в полном объеме подготовительных работ под отделку стен и потолков, а также без выполнения работ по внутренней отделке помещений (без наклейки обоев, покраски, облицовки), без покрытия полов, без установки дверных блоков в межкомнатных перегородках, без установки санитарных приборов и оборудования (кроме унитаза и приборов учета воды).

Стены: наружные и межкомнатные перегородки – железобетонные панели.

Перекрытия – железобетонные.

Окна – из деревянного профиля.

Двери наружные – деревянные.

Отопление – центральное.

Электроснабжение – скрытая проводка.

Вход в помещение – автономный, не связанный с жилой частью.

Проектно-сметной документацией предусмотрены в жилом доме: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, мусоропровод, лифт, лоджии, остекление лоджий.

Стоимость 1 м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации – административного помещения – **15 480 000 руб.**

Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома №770 от 15 марта 2012 г., свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 21 мая 2012 г. № 500/600–2119.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности:

крыши, технические этажи, подвалы, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Предполагаемый ввод дома в эксплуатацию – март 2013 г.

Строительство дома осуществляется застройщиком на основании решения Мингорисполкома №770 от 15 марта 2012 г. собственными силами без заключения договоров подряда.

Порядок приема заявлений от лиц, желающих принять участие в долевом строительстве помещения:

Прием заявлений осуществляется отделом собственного строительства и инвестиций ОАО «МАПИД» (г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205а, кабинет №1, тел. 207 19 15) с 22 марта 2013 г., ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, понедельник–четверг с 9.00 до 17.00, обед с 12.45 до 13.30, в пятницу с 9.00 до 15.00, обед с 12.45 до 13.30.

Если лицо, желающее принять участие в долевом строительстве, в течение пяти календарных дней с момента регистрации его заявления не явилось для заключения договора и не сообщило об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и ОАО «МАПИД» оставляет за собой право заключить договор на строительство помещения с другим лицом.

О ходе работ по строительству можно узнать по телефонам отдела собственного строительства и инвестиций ОАО «МАПИД»: 207 19 15, 208 58 12, 207 16 73.

■ Чалавек сярод людзей

Я НЕ Я, І... СПРАВА НЕ МАЯ,

альбо Аб тым, чаму і сёння можна знікнуць без звестак

Колькі людзей на зямлі, столькі лёсаў — простых і складаных, шчаслівых і не вельмі... Некага абмінуць у жыцці каханне, дзеці, удача. Іншага, калі пашанцуе, хваробы і страты. Але смерць не абмінула яшчэ нікога. Таму, пэўна, так балюча раніць непавага да яе...

«Добра, што пенсія сёмага...»

Вёска Палачаны, кажуць месцічы, некалі была шматлюднай і вясёлай. Цяпер састарэла. Апусцела нядаўна яшчэ адна хаціна... Пахавалі Лявона Аляксеевіча Канановіча з вуліцы Савецкай. Пражыў ён, ветэран працы, 75 няпростых гадоў. Пражыў, як умеў. Пасля арміі вярнуўся ў родную вёску, дзе ўсё жыццё прапрацаваў доярам. «Калі мы з сястрой яшчэ малыя былі, мама часта хварэла, — распавядае пры сустрэчы малодшая дачка Лявона Аляксеевіча Ганна Рындзевіч. — Таму і мы, і дом, і гаспадарка — усё клалася на бацькавы плечы... Пра сябе ён не вельмі клапаціўся. Паехаў 4 лютага да старэйшай сястры ў Маладзечна і не даехаў...»

— Мы жылі асобна, — працягвае свой аповед Ганна. — Татка — у Палачанах. Я — у суседняй вёсцы, Яхімоўшчыне. Так здарылася, што мама памерла ў 99-м годзе. Як яе не стала, тата пачаў выпіваць. У кожнай вёсцы, самі ведаеце, ёсць людзі, якія нідзе не працуюць. Вось і панадзіліся яны да таты хадзіць. Асабліва ў пачатку месяца, калі той пенсію атрымае. Але да нас ён пераязджаць не хацеў, не збіраўся, хоць мы і прапаноўвалі...

Ганна Рындзевіч ля апусцелай бацькоўскай хаты.

Апошні раз Ганна бачыла бацьку ў панядзелак, 4 лютага. Увечары пасля працы вярталася дадому. Шлях праходзіў уздоўж чыгункі.

— Гляджу, сядзіць. Падышла да яго: «Татка, ты куды?» — «Еду во да Лены». — «Чаго? Можа грошы патрэбны? Дык я табе дам, каб ты не ехаў». Ён кажа: «Калі ёсць, дай мне 2 рублі, бо я на дарогу пазычыў». У мяне было драбнейшымі 22 тысячы. Дала яму. І пабегла далей, каб паспець да цёмнага.

...Прайшоў дзень, другі... Па даросе на працу Ганна заўважыла, што фіранка на акне бацькоўскай хаты не кранута, сцежкі ў снезе няма. Спачатку падумала: «Ён жа ў Лены. Можа, яна куртку яму памыла. А 7-га ў яго пенсія, пэўна, вернецца?». Але ж калі ў гэты дзень на пошце сказалі, што ні пенсію, ні газету бацька не забіраў, сэрца адчула нядобрае. Патэлефанавала да сястры ў Маладзечна...

— Алена сказала, што бацька не прыязджаў, — успамінае Ганна. — Стала тады званіць у бальніцу, у міліцыю, лінейны аддзел. Ніхто нічога не ведае... Зноў набрала 102. Дыспетчар у мяне пытаецца: «Вы хочаце зрабіць вусную заяву?» — «Не ведаю, ніколі не была ў такой сітуацыі. Можа, мне пад'ехаць куды трэба, ці што?» У мяне распыталі, як завуць тату, з якога ён года, ці было такое, каб сыходзіў надоўга з дому. «Не, кажу, ніколі». Мне сказалі, што зараз прыедзе ўчастковы і больш падрабязна са мной пагутарыць. Літаральна хвілін праз 10-15 ператэлефанавалі на мабільны і паведамілі, што тату знайшлі мёртвым яшчэ 4 лютага... На вуліцы Віленскай у Маладзечне.

... Дочкі адразу ж паехалі ў морг, каб забраць бацьку. «А чаму вы так позна прыехалі? Мы думалі, што дзядок пойдзе ў выхадныя на камунальнік», — пачулі папрок на свой адрас.

— Калі шчыра, я адразу нават і не зразумела, што такое камунальнік, — з крыўдай у голасе кажа Ганна. — Потым ужо жанчына з рэгістратуры сказала, што пахавалі б яго камунальныя службы як нікому не патрэбнага... Ведаеце, якім бы татка ні быў, мы ж ніколі ад яго не адмаўляліся!.. Дзякуй Богу, што паспелі. Пахавалі, як трэба.

— Як гэта так, пры сабе ў чалавека былі дакументы, і ніхто не паведаміў, — абураюцца суседзі. — Можна ж было ў сельсавет патэлефанаваць ці на пошту... Перадалі б: гэта ж вёска, усе адзін аднаго ведаюць. Што з людзьмі стала? Я не я, і хата не мая...

— Тата заўсёды ездзіў з дакументамі, — плача дачка. — Не раз казаў, што «калі са мной што здарыцца, дык хоць будзеце ведаць, дзе я».

«Успамінаю сваю матулю, — пісала ў «Звязду» Наталля Яцукевіч. — Збіраючыся ў дарогу, яна заўсёды ва ўсе кішэні клала запіскі з адрасам, тэлефонамі, каб ведалі, хто і адкуль, калі, не дай Бог, на вуліцы памрэ. А аказваецца, і дакументы не гарантыя...»

— Мне людзі кажуць, вам трэба скаргу пісаць, — дзеліцца Ганна. — А што ад гэтага зменіцца? Тату не вернеш, а з міліцыяй цягацца сабе даражэй... Хацелася б проста ў вочы паглядзець чалавеку, які нічога не паведаміў і пры гэтым спакойна спаў...

«Калі цела ніхто не забірае...»

Адразу ж з Палачан я накіравалася ў морг, каб, замест дачкі Лявона Канановіча, паглядзець у вочы абыякавасці.

— Чуеце пах? Сёння прывезлі цела, — кажа **мэдрэгістратар Маладзечанскага аддзялення медыцынскіх судовых экспертыз Галіна Квяткоўская.** — Інвалід тыдзень ляжаў дома. Толькі падумайце, за цэлы тыдзень ніхто не праведаў яго, не патэлефанаваў, не пацікавіўся...

Калі я сказала, з якой мэтай прыйшла, жанчына разгарнула журнал рэгістрацыі...

«Збіраючыся ў дарогу, матуля заўсёды ва ўсе кішэні клала запіскі з адрасам, тэлефонамі, каб ведалі, хто і адкуль, калі, не дай Бог, на вуліцы памрэ. А аказваецца, і дакументы не гарантыя...»

— Вось. Кананоўіч Лявон Аляксеевіч паступіў да нас увечары 4 лютага, — зачытвае яна. — 5-га чысла правялі анатаміраванне. Прычына смерці — інфаркт. Алкаголь у крыві не выяўлены... А, здаецца, узгадваю... Дачка Канановіча плакала, крыўдзілася, што не паведамілі пра смерць бацькі...

— А чаму не паведамілі?

— Гэта абавязак Следчага камітэта і міліцыі. Мы пасля анатаміравання цела кладзём у халадзільнік. Яго можна трымаць там 10 дзён. Такія правілы. Недзе на сёмы дзень пачынаем тэлефанаваць у праваахоўныя органы, каб удакладніць, ці знайшлі яны сваякоў. Калі не, тады пішам ліст на дазвол аб пахаванні камунальнымі службамі. На шчасце, гэта не часта здараецца. Бываюць выпадкі, што суседзі хаваюць: ведаюць, што больш няма каму, што чалавек адзін ва ўсім свеце.

На пытанне, ці былі ў Лявона Канановіча пры сабе дакументы, Галіна Квяткоўская не змагла дакладна адказаць: «Не буду прыдумляць, не памятаю. Нашы эксперты працуюць на падставе пастановы аб прызначэнні судова-медыцынскай экспертызы, якую выносіць Следчы камітэт».

Я папрасіла прынесці з архіва тую пастанову. У ёй рукой старшага следчага Маладзечанскага РАСК напісана і прозвішча, і дата нараджэння памерлага. У канцы прыпіска: «Пасля правядзення анатаміравання дазваляю выдачу трупа і яго маёмасці сваякам, асобам, якія займаюцца яго пахаваннем».

— Выходзіць, былі пры сабе дакументы. Чаму тады следчы не паведаміў?

Жанчына толькі паціснула плячыма:

— А Бог яго ведае..

«Прабіў па базе», але нумара тэлефона не знайшоў...»

Прозвішча старшага следчага, які выязджаў на месца здарэння, я даведалася з пастановы, пра якую ішла гаворка вышэй. Знайшла яго на працоўным месцы, у Маладзечанскім раённым аддзеле Следчага камітэта.

«А вы дакладна да мяне?» — здзівіўся малады мужчына. Пасля таго, як я ў двух словах распавяла, чаго прыйшла, сказаў, што, перш чым даваць каментар, яму трэба «ўвесці ў курс спраў» сваё кіраўніцтва. Зайшоў у адзін кабінет, пасля ў другі. Недзе хвілін 5-7 давялося чакаць яго ў цёмным калідоры. Калі выйшаў, з палёгкай выпаліў, што я звярнулася не па адрасе. Маўляў, справа перададзена ў РАУС, бо экспертызай не было ўстаноўлена складу злачынства.

Калі пачала пытацца, чаму ён нічога не паведаміў сваякам (у пашпарце ж чорным па белым напісана, што пражывае чалавек у аграгарадку Палачаны па вуліцы Савецкай, 56), следчы папрасіў выключыць дыктафон. «Дык чаму не паведамілі?» — не адступала я ўжо без дыктафона. У адказ пачула, што ён «прабіў па базе» прозвішча, але там хатняга нумара тэлефона не знайшоў. Калі б знайшоў, то патэлефанаваў бы. Калі я пачала даводзіць, што на месцы гэтага чалавека мог бы быць любы, ён са словамі: «Навошта вы мне задаяце такія пытанні?» — накіраваўся ў бок свайго кабінета... Усё, маўляў, размова скончана.

Начальнік аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі РАУС Маладзечанскага райвыканкама Валерый Кучаронак пацвердзіў, што сапраўды, 5 лютага справа была перададзена... Праўда, гартаючы матэрыялы, ён не знайшоў там ніякай запіскі ад Следчага камітэта з просьбай знайсці сваякоў. «Пра смерць ім павінен быў паведаміць старшы следчы аператыўнай групы, які выязджаў на месца. Калі ж па нейкай прычыне ён гэтага не зрабіў, то трэба было папярэдзіць аб гэтым дзяжурнага РАУС альбо ўчастковага».

Пашчасціла: участковы Раман Ахметаў, які займаўся гэтай справай, якраз у той момант зайшоў у кабінет свайго начальніка. «Я, — кажа, — быў упэўнены, што са сваякамі звязаліся ў дзяжурныя суткі».

— Часта, калі працаваў следчым, — працягнуў Валерый Кучаронак, — даводзілася выязджаць на месцы ДТЗ са смяротным зыходам. Заўсёды неадкладна паведамляў сваякам, як бы цяжка не было...

У галаве не ўкладвалася, не верылася, што такое магчыма: дзве службы — аддзел унутраных спраў і аддзел Следчага камітэта — седзячы ў адным памяшканні, не знайшлі магчымасці перадаць, ну хоць на словах, такую інфармацыю! Нават не са службовага пункту погляду — з чалавечага...

Каб развеяць апошнія сумненні, падыходжу да таксафона і яшчэ раз набіраю нумар старшага следчага.

— Гэта зноў са «Звязды». Вы прыкладалі да справы...

— Я прашу прабачэння, але я вам ужо сказаў, што не буду даваць каментарыі. Усе матэрыялы, якія неабходна, я прыклаў...

— Я не прашу каментар. Мне толькі трэба ведаць, прыкладалі ці не запіску, што не паведамілі сваякам.

— Не, не прыкладаў.

— І вусна не перадавалі?

— Не...

Ад аўтара

Вам калі-небудзь даводзілася адчуваць сябе... сумленнем іншага чалавека? Мне давялося. І, шчыра прызнаюся, не вельмі прыемнае гэта пачуццё... Адчуванне, што ад цябе хочуць як мага хутчэй пазбавіцца, не бачыць, не чуць... Першы раз — калі старшы следчы зусім не па-джэнтльменску пакінуў мяне ў цёмным калідоры, зачыніўшы перад носам дзверы свайго кабінета. Другі — калі, неўзабаве пасля той апошняй непрацяглай тэлефоннай размовы, выпадкова сустрэла яго ля дзяжурнай часці. Следчы мяне... не пазнаў. Альбо зрабіў выгляд, што не пазнаў...

Вельмі доўга вагалася, агучваць прозвішча гэтага чалавека ці не на ўсю краіну. Раілася са старэйшымі і (вядома ж) мудрэйшымі калегамі... Вырашылі — не варта. Бо ў гэтага маладога чалавека, напэўна ж, ёсць бацькі, дзеці, жонка, якія ні ў чым не вінаваты. І хочацца верыць, не ўхвалілі б учынак свайго сямейніка... Тым больш што кіраўніцтва гэтага старшага следчага, прынамсі, да якога ён хадзіў раіцца, калі палічыць патрэбным, прыме (а мо і ўжо прыняло) нейкія меры. Як мінімум, прагаворыць гэту сітуацыю з кожным следчым, у абавязкі якога ўваходзіць выезд на месца здарэння. Каб такое больш не паўтарылася...

Што самае сумнае ў гэтай сітуацыі, у вачах таго чалавека я не прачытала раскаяння.

Але мне вельмі хочацца верыць, што гэта толькі падалося... Што ён абавязкова знойдзе ў сабе сілы і папросіць прабачэння ў дачок Канановіча. Што яго памылка стане ўрокам для усіх, хто прачытае гэты артыкул... Для чаго, дарэчы, ён і быў напісаны.

Бо як гэта так?!. Мы глядзім праграму «Чакай мяне» па тэлевізары і плачам. Сотні валанцёраў проста так, з-за душэўнай дабрыні, шукаюць без вестак зніклых людзей. А камусьці на службе (!) за амаль тыдзень (!) не хапіла часу зняць тэлефонную трубку і набраць нумар...

Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.

Маладзечанскі раён

■

■ Рэпартаж з глыбінкі

КАЛІ ГАРЭЛКА П'Е ЦЯБЕ ДА ДНА

Старыя агітацыйныя плакаты «П'янству — не!», «Алкаголь — вораг розуму» і дзясяткі іншых даўно ўжо сталі легендарнымі. Праўда, з часоў іх выдання асартымент спіртавой прадукцыі на вітрынах крам вырас, а вось кошт адносна заработнай платы рэзка знізіўся. Не перавяліся і падпольныя дзялкі, якія адчулі смак халяўных грошай. А за ўсім гэтым стаяць лёсы людзей, якія з-за розных прычын вырашылі шукаць паратунак ад жыццёвых праблем у пляшцы.

Ва ўчастковага інспектара Валожынскага РАУС Ігара Сухадольца багатая біяграфія. Тэрміновую службу праходзіў у маскоўскім спецназе. Меў шэсць вылетаў у «гарачыя кропкі» — Ерэван, Баку, Тбілісі, Фергану... Дэмабілізаваўся ў студзені 1990 года і пайшоў служыць у Валожынскі РАУС. Спачатку быў звычайным «операм», але ў 1996 годзе прызначылі на цяперашнюю пасаду.

Участак Ігара Сухадольца складаецца з дваццаці чатырох вёсак. Гэта Узбалацкі сельсавет цалкам і часткова Валожынскі. У рэйды даводзіцца ездзіць вельмі часта. Рэгулярна праводзяцца аперацыі рознага кшталту — «Нагляд», «Арсенал», «Нелегал»... Але найбольш папулярныя рэйды па самагоншчыках і тых, хто раней меў праблемы з алкаголем.

«А наш прытончык робіць самагончык...»

Лоўлю самагоншчыкаў, па сутнасці, можна назваць штодзённай працай. Вядома, ніводны падпольны дзялок не ўзрадуецца, калі да яго знянацку прыедуць з праверкай. А каб зберагчы незаконна нажытае дабро, ідуць на рознае. Адзін пераходзіць у атаку і імкнецца выпіхнуць міліцыянераў з хаты ці нацкуўвае на іх сабак. Бывае і так, што злоўленыя «за руку» самагоншчыкі барыкадуюць дзверы і пачынаюць шпурляць праз вокны розныя прадметы. На шчасце, да фізічнага супраціўлення даходзіць рэдка. Часцяком абіраюць пасіўную тактыку — зачыняюцца знутры і ціха сядзяць, быццам бы нікога і няма. А нядаўна быў выпадак, калі знайшлі ў аднаго з самагоншчыкаў незарэгістраваную паляўнічую стрэльбу.

— Чым даўжэй чалавек прадае самагонку, тым менш шанцаў на тое, што ён адмовіцца ад лёгкага спосабу нажывы, — лічыць інспектар. — Яму ж усё роўна, каму прадаць свой тавар, абы за яго заплацілі грошы. І таму яго «кліентура» — пераважна хранічныя алкаголікі, якія тым самым толькі паскараюць свой шлях у лячэбна-працоўны прафілакторый.

ДАВЕДКА: *Супраціўленне супрацоўніку міліцыі пры выкананні ім службовых абавязкаў можа давесці і да турэмных нар. Артыкул 363 Крымінальнага кодэкса Беларусі прадугледжвае за гэта розныя меры пакарання — ад папраўчых работ ці арышту да двухгадовага пазбаўлення волі.*

І адрас памяняў ён — свой дом на ЛПП...

Псіхалагічныя ўшчуванні на аматараў спіртнога часта не дзейнічаюць, і тады застаецца толькі адзін варыянт — накіраванне ў лячэбна-працоўны прафілакторый. Але каб туды трапіць, яшчэ трэба пастарацца. Небараку пасля чатырох адміністрацыйных правапарушэнняў чакае медыцынская камісія, якая ўстановіць яго прыдатнасць да знаходжання ў гэтай установе. Гэта як своеасаблівая «жоўтая картка» — сур'ёзнае папярэджанне. На гэтым этапе яшчэ можна ўсё перайграць. Калі ж п'янюга працягвае сваю ранейшую палітыку, то ён праходзіць праз паўторную камісію. Вынесены раней вердыкт мае шанцы пацвердзіцца, і тады справа перадаецца ў суд.

Калі аматар спіртнога трапляе ў прафілакторый, то гэта лепш для ўсіх — менш злачынстваў, менш скандалаў на нецвярозай глебе, спакайней пачуваюць сябе суседзі.

А п'янства разгулялася не на жарт. Толькі ў мінулым годзе на ўчастку Ігара Сухадольца свой адрас часова змянілі шэсць чалавек. Сем закадзіраваліся. Сёлета сітуацыя яшчэ больш напружаная. Паўторную камісію дзеля накіравання ў ЛПП за студзень і люты прайшлі ўжо тры чалавекі. Яшчэ шасцёра — прайшлі першую.

П'яніцу амаль заўжды хвалюе толькі адна праблема — дзе дастаць чарговую пляшку з запаветнымі «градусамі». Ён перастае сачыць за сваім жыллём. Двор паступова ператвараецца ў звалку. Але калі чалавек завязвае з гарэлкай, то гэта відаць няўзброеным вокам — ён фарбуе хату, рамантуе плот, наводзіць парадак на двары... У хаце з'яўляецца новая бытавая тэхніка. Хтосьці спыняецца на этапе папярэджання аб адпраўленні ў ЛПП. Кагосьці перавыхоўваюць ужо там. Але такіх шчасліўчыкаў прыкладна палова. Астатнія ж працягваюць паціху співацца.

Між іншым, даводзіцца афармляць такія дакументы і на зусім маладых. Ёсць такі «кліент» Р. Яму крыху больш за дваццаць. Але ўжо хаваўся ад прызыву ў армію, вельмі любіў выпіць і пайсці пасля на крымінальныя «подзвігі». Зараз ён знаходзіцца ў ЛПП.

Рэйд па былых аматарах алкаголю носіць пераважна кантрольны характар. Не сакрэт, што выпіць у дзень зарплаты даўно стала ледзь не традыцыяй. А «сарвацца» пасля лячэння ад алкагольнай залежнасці вельмі проста. І зачастую чалавек становіцца «буйным». Здараецца і так, што лятаюць нажы, відэльцы, сякеры... І нават нягледзячы на прысутнасць супрацоўніка міліцыі. Добра, калі рэйд адбываецца з напарнікам, які падстрахуе ў надзвычайнай сітуацыі.

«Гарэлка — гэта зло, на сабе спазнала...»

Службовы аўтамабіль пад'язджае да прыгожа пафарбаванай у яркія колеры драўлянай хаты. У аконных праёмах стаяць шклопакеты. Адразу відаць: тут жыве гаспадарлівы чалавек.

— Не паверыце, але жанчына, якая тут пражывае, сем гадоў таму моцна піла. Але не буяніла, таму і заяў на яе не паступала, — гаворыць Ігар Сухадолец, пакуль мы прабіраемся праз гурбы снегу. — Але аднойчы сама да мяне прыйшла і кажа: «Дапамажыце, таварыш міліцыянер, паміраю я ад гарэлкі. І кінуць хачу, але не адпускае, праклятая...» — «Як дапамагчы? Давай «хуткую» выклічу». Урач-нарколаг яе вылечыў, абышліся, на шчасце, без прафілакторыя.

У невялічкім пакоі адразу кідаецца ў вочы стары сервант, дзе стаяць кнігі і посуд. Па тэлевізары ідзе адно з расійскіх судовых шоу, за перыпетыямі якога сочыць жанчына. На вялікім засланым крэсле ля тэлевізара ляжыць цацачны воўк. З ім гуляецца маленькі сын. У хаце пануе мікраклімат утульнасці. Нават і не верыцца, што колькі гадоў таму ўсё было зусім інакш...

— Дзень добры! А чаму ваш малодшы не ў школе?

— Ды прастуда прычапілася, ліха на яе. Прыходзіла доктарка, сказала, каб дома пасядзеў тыдзень.

— А да спіртнога не цягне больш?

— Не-е. Гарэлка — гэта зло, на сабе спазнала. Не хачу я больш вяртацца ў тое жыццё. Нічога я там не мела, акрамя прагі да бутэлькі. Зато цяпер маю пастаянную працу, грошы зарабляю, дзяцей гадую...

«Памерла дзіця — бацькі не вытрымалі і пачалі піць»

Праз некалькі хвілін пад'язджаем яшчэ да аднаго прыватнага дома ў суседняй вёсцы. Там жыве С. Тры вялізныя сабакі на двары ледзь не захліпаюцца ад лаю. Відаць, чужыны тут ходзяць рэдка...

Некалькі гадоў таму сям'ю напаткала вялікая гора — памерла малое дзіця, якому было некалькі месяцаў. Бацькі не вытрымалі і пачалі піць. Ужо і сваякі пачалі прасіць накіраваць С. у прафілакторый, каб было спакайней. Наш герой ужо прайшоў першую камісію, справа рыхтавалася да перадачы ў суд, але чалавек раптоўна ўзяўся за розум. З'ездзіў у горад, закадзіраваўся. І вось ужо трымаецца больш за год...

— Прывітанне! Як жыццё? — амаль па-сяброўску вітаецца міліцыянер з невысокім ударлявым чалавекам, гаспадаром хаты.

— Ды вось у хаце рамонт раблю. Скутар сабе набыў... Ды вы заходзьце, не бойцеся сабак.

З нізенькіх сенцаў праходзім ледзь не ў царскі пакой. На падлозе ляжыць кілім. Сцены паклеены шпалерамі ў цёплых танах. Новая мэбля — крэслы, маленькі пісьмовы стол. На тэлевізары размерана цікае старэнькі гадзіннік.

— А сабак навяжы, калі ласка. Нельга, каб яны без ланцуга былі, — наказвае інспектар.

Замест эпілога, або Крадзеж па-сельску

Цяга да спіртнога прыводзіць часам і да даволі кур'ёзных выпадкаў. Аднойчы ў Валожынскім раёне адразу пасля Новага года абрабавалі сельскую краму. Зламыснікаў цікавілі зусім не грошы, а... скрыня з запаветнымі бутэлькамі. А каб доўга не несці важкі груз, яны выбралі месцам сваёй дыслакацыі закінутую хату праз сотню метраў ад крамы. Пошук цягнуўся нядоўга — сляды на снезе вялі дакладна па адрасе. Зайшлі міліцыянеры ў будынак і бачаць: стаіць скрыня, побач валяюцца пустыя бутэлькі з-пад гарэлкі, а на падлозе сядзіць чалавек. «Дзе другі?» — «Не скажу!» І тут з шафы пачуўся храп...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Валожынскі раён

■

■ Справы дабрачынныя

НА ПОШУКІ ВЫХОДЗІЦЬ «АНЁЛ»

Часам у міліцэйскіх зводках можна прачытаць — чалавек прапаў без звестак, аб'яўляецца пошук. Больш за ўсіх гэта датычыцца ягаднікаў і грыбнікоў, якія заблудзіліся ў лесе. Аднак здараецца і так, што хтосьці паехаў на заробкі ў іншую краіну, а пасля перастаў выходзіць на сувязь. Вядома, чалавека шукаюць. Шанцы на поспех павялічваюцца, калі да справы падключаецца як мага больш людзей. У Беларусі ўжо амаль год існуе валанцёрскі пошукава-выратавальны атрад «Анёл», які дапамагае знаходзіць зніклых без вестак.

Камандзір атрада Сяргей Коўган адначасова працуе ў таварыстве «Чырвонага Крыжа» спецыялістам па надзвычайных сітуацыях. Ён сцвярджае, што ідэя ў дзвюх арганізацый адна — дапамагаць людзям у цяжкіх сітуацыях. Толькі кожная робіць гэта па-свойму.

Валанцёры атрада знайшлі ўжо каля 60 чалавек

— Больш за ўсё запомніўся выпадак з Сяргеем П. Праўда, гэта ўжо не датычылася непасрэдна пошукаў. Месяц таму да нас звярнуліся людзі, якія падабралі на шашы маладога паўапранутага чалавека, які ішоў у бок Масквы. Але не ведалі, куды звярнуцца па дапамогу, і звярнуліся да нас.

Высветлілася, што ў Расіі бандыты аднялі ў хлопца кватэру, на аўтамабілі вывезлі яго ў Беларусь і выкінулі. Далі яму крыху грошай і прыстрашылі, каб нават і не спрабаваў вярнуць сабе жыллё. Кватэра дасталася яму ў спадчыну ад маці.

Ішоў хлопец па шашы ў Маскву, а што рабіць далей і не ведаў. З дапамогай расійскай паліцыі мы высветлілі, што праблем з законам ён не меў. Паразмаўлялі з яго былым класным кіраўніком, з дырэктарам дзіцячага дома, дзе гадаваўся, — і зразумелі, што чалавек не маніць. І «Чырвоны Крыж» дапамог Сяргею, як мог. У тым ліку і цёплай вопраткай.

— А як узнікла ідэя шукаць менавіта зніклых людзей?

— Атрад быў створаны па маёй ініцыятыве ў чэрвені мінулага года. Ідэя прыйшла выпадкова. У адной з тэлевізійных праграм пачуў аповед жанчыны, чый бацька пайшоў у Барысаўскім раёне ў лес па грыбы і прапаў. Яна звярталася да ўсіх хто толькі можа з просьбай прыехаць на пошукі. Адгукнуліся толькі мы з сябрам. Так і з'явілася ідэя стварыць рух з людзей, якія ў свой вольны час могуць дапамагчы ў пошуку.

Праект стартаваў 15 чэрвеня 2012 года. Менавіта тады ў найбуйнейшых сацыяльных сетках з'явілася група пошукава-выратавальнага атрада. Я быў фактычна першапраходцам, усё давялося ствараць з нуля. Зараз у групе ўдзельнічаюць каля дзесяці тысяч чалавек.

Удзельнічаць — не проста значыцца ў спісках, людзей трэба рыхтаваць. Яны мусяць умець карыстацца компасам, навігатарамі і рацыямі. Закупляем і спецыяльнае абсталяванне — магутныя ліхтары, стацыянарныя радыёстанцыі, генератары. Трэба не толькі прыехаць з голымі рукамі, але і быць карысным практычна. Буйныя валанцёрскія групы, дзе больш за тысячу людзей, сёння скамплектаваны ў Мінску, Гомелі, Брэсце. Леташнім вераснем у Смаленскай вобласці адбыліся спецыялізаваныя практычныя вучэнні па пошуку людзей.

— З'яўленне такога атрада не магло прайсці міма ўвагі міліцыі.

— Пра «Анёл» там даведаліся літаральна з самых першых дзён яго існавання. Спачатку толькі назіралі, не ўмешваючыся ў сам працэс. Праз некаторы час супрацоўнікі крымінальнай міліцыі мне растлумачылі, што яны імкнуліся знайсці карыслівыя мэты нашага дзеяння. Аднак зразумелі, што ніякага ўзнагароджвання атрад за пошук не бярэ, усё робім на добраахвотных пачатках і на ахвяраванні валанцёраў. Запрасілі да сябе на гутарку, дзе мы і знайшлі пункты сутыкнення. Спачатку да нас ставіліся не вельмі сур'ёзна. Але валанцёры знаходзілі аднаго чалавека за другім, і паступова да нас стала паступаць больш інфармацыі і ад людзей у пагонах. Закон дазваляе ім у такіх выпадках супрацоўнічаць з грамадскасцю. Бо пры неабходнасці міліцыя звяртаецца па дапамогу да мясцовых жыхароў, егераў, паляўнічых. А чым мы горшыя, тым больш, калі падрыхтаваны да працы ў такіх умовах? Галоўны прынцып, як і ва ўрача — не нашкодзь. Таму мы размяшчаем інфармацыю аб зніклых людзях толькі тады, калі ў гісторыі няма ніякага крыміналу.

— Але ж для ўдалага пошуку трэба апавясціць максімальна большую колькасць людзей.

— У пошуку вельмі дапамагаюць сацыяльныя сеткі. Мы не зацыкліваемся толькі на сваёй групе. Валанцёры робяць перапосты ў групах, дзе колькасць удзельнікаў ідзе на дзясяткі тысяч. З'явіўся ў інтэрнэце і спецыяльны сайт, дзе змяшчаецца інфармацыя пра зніклых без вестак людзей у Беларусі, Расіі і Украіне.

Найбольш запомніліся самыя першыя пошукі, калі прапала мінчанка Ксенія Маркевіч. Шукалі мы вельмі старанна. Арыенціроўкамі абклеілі ўвесь горад, апытвалі людзей, выязджалі на меркаваныя месцы яе знаходжання, хадзілі па начных клубах, тэлефанавалі ў бальніцы і моргі, наведвалі садовыя таварыствы, закінутыя піянерскія лагеры — словам, рабілі ўсё, што маглі. Валанцёры выходзілі ў паркі Горкага і Чалюскінцаў з арыенціроўкамі, і кожны другі казаў, што ўжо бачыў налепку — на пад'ездзе, на краме, на прыпынку грамадскага транспарту. Тым самым мы дабіліся таго, што цяжка было пасля знайсці чалавека, які б не чуў пра гэтую дзяўчыну. Нават у міліцыі зазначылі, што такіх маштабных пошукаў у краіне яшчэ ніколі не было.

Камандзір атрада Сяргей Коўган на вучэннях па пошуку зніклых людзей у Смаленскай вобласці.

У Расіі бандыты аднялі ў хлопца кватэру, на аўтамабілі вывезлі яго ў Беларусь і выкінулі. Далі яму крыху грошай і прыстрашылі, каб нават і не спрабаваў вярнуць сабе жыллё.

— Дарэчы, ці не ўзнікала нейкіх недарэчнасцяў пры расклейванні арыенціровак?

— Трэба ўсё рабіць па правілах і з разуменнем абстаноўкі, а не свавольнічаць. Напрыклад, валанцёр ідзе да адміністрацыі якойсьці крамы і тлумачыць сітуацыю. Што адметна, мы яшчэ не пачулі ад гандляроў ніводнай адмовы. Арыенціроўкі можна знайсці нават у буціках. Былі выпадкі, калі валанцёраў, якія клеілі ўлёткі на вуліцах, спынялі міліцыянеры і пыталіся, што яны робяць. Ніхто не забараняў клеіць, але папярэджвалі, што лісток пазней будзе зняты — з дрэва, з ліхтарнага слупа, са сцяны пад'езда... Вось, дарэчы, калі шукалі Ксенію Маркевіч, за некалькі дзён да святкавання ў сталіцы Дня горада кожны аўтобусны прыпынак у цэнтры Мінска быў заклеены арыенціроўкамі. Іх знялі, а пасля свята мы зноў усё аднавілі.

— І якія поспехі ў «Анёла»?

— Мы знайшлі каля шасцідзесяці чалавек. Адшукваліся людзі, якія страцілі памяць, дзеці, якія збеглі з інтэрната ў іншы горад. Аднагодкі пазнавалі іх па фотаздымках, змешчаных у сацыяльнай сетцы. У Мёрскім раёне Віцебскай вобласці шукалі мужчыну, які пайшоў па ягады і прапаў. Тады да яго пошукаў падключыліся адначасова каля сотні валанцёраў. Пасля нядаўняга вызвалення беларусаў з Дагестана да нас пачалі звяртацца па дапамогу людзі, чые сваякі зніклі бясследна не адзін год таму, паехаўшы на заробкі ў іншыя краіны. Мы запатрабаваны.

❑❑❑

...Чакаючы на прыпынку трамвай, увагу прыцягнула старэнькая арыенціроўка на чалавека, які пайшоў на працу і не вярнуўся дахаты. Відаць, што яна вісіць тут ужо даволі даўно: пераменлівае беларускае надвор'е моцна пашкодзіла лісток паперы. Тым не менш, за дзесяць хвілін падышлі і прачыталі яе двое...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота з архіва ПВА «Анёл»

■

Леанід ЛЕВІН:

«ДАБРО І ЗЛО ПЛЫВУЦЬ У АДНОЙ ЛОДЦЫ»

Вось ужо сапраўды: таленавіты чалавек таленавіты ў многім. І тым не менш свае літаратурныя творы Леанід Мендэлевіч расцэньвае як аматарства, своеасаблівае хобі і прызнаецца, што ў гэтай сферы адчувае сябе не зусім упэўнена. Таму калі яго кнігі хваляць (а хваляць вядомыя пісьменнікі!), ён бянтэжыцца і лічыць, што яго здольнасці ў гэтым перабольшваюць.

Іншая справа — архітэктура. Тут Леанід Мендэлевіч дакладна ведае цану і сваім уласным работам, і работам сваіх калег. Права на строгую, бескампрамісную ацэнку даюць яму не толькі высокія ўзнагароды (званні заслужанага архітэктара рэспублікі, лаўрэата Ленінскай прэміі і Дзяржаўных прэмій Беларусі, акадэміка архітэктуры), але і высокая планка зробленага.

Вяршыня яго творчасці — сусветна вядомы мемарыяльны комплекс «Хатынь». Скрушна-пранізлівы сімвал жалобы і смутку. Велічны помнік чалавечай мужнасці і веры. Народны храм Памяці. З'ява ў манументальным мастацтве. Праз «Хатынь» мовай мастацтва ўдалося раскрыць душу беларускага народа, яго прыгажосць, яго трагедыю, яго бяссмерце. Напоўнены хвалюючым, кожнаму зразумелым агульначалавечым зместам, мемарыяльны комплекс разам з тым абсалютна беларускі, глыбока нацыянальны па форме.

З не меншай эмацыянальнай сілай і мастацкай выразнасцю, глыбінёй спасціжэння трагедыі яўрэйскага народа, яго моцы і велічы выкананы помнікі-мемарыялы ахвярам халакосту — «Яма» ў Мінску і Гарадзейскае гета.

Леанід Левін разам са скульптарам Анатолем Анікейчыкам стварыў першы ў рэспубліцы манументальны помнік беларускім партызанам — «Прарыў» пад Докшыцамі — і пры ўдзеле скульптара Аляксандра Фінскага — першы мемарыял дзецям-ахвярам Вялікай Айчыннай вайны ў Красным Беразе Жлобінскага раёна. І яшчэ дзясяткі архітэктурна-скульптурных аб'ектаў, якія адлюстроўваюць мужнасць і гераізм савецкіх людзей, памнажаюць славу і гонар нашай рэспублікі.

І кожны з гэтых аб'ектаў прапушчаны Майстрам праз сэрца, амаль кожны пакінуў на ім свой рубец. І гэта не журналісцкі штамп, не банальная метафара. Гэта — суровая рэальнасць. Леанід Мендэлевіч перажыў чатыры інфаркты, перанёс дзве цяжкія кардыялагічныя аперацыі. А год таму здарылася яшчэ адна бяда — інсульт, ачуняць ад якога канчаткова не ўдалося да гэтага часу.

Але пра гэта Леанід Мендэлевіч гаварыць не любіць. І нават самому сабе не дазваляе думаць пра нейкія там балячкі. Кожны дзень, як і раней, — увесь у клопатах, у творчых пошуках, у віры грамадскай дзейнасці.

Вось толькі некалькі найбольш значных эпізодаў аднаго тыдня.

Сустрэча ў майстэрні з міністрам культуры Паўлам Латушкам і амаль чатырохгадзінная гутарка аб праблемах культурнага жыцця ў рэспубліцы. Сустрэча з Надзвычайным і Паўнамоцнам Паслом Ізраіля ў Беларусі Іосіфам Шагалам і перамовы наконт другой чаргі праекта мемарыяльнага комплексу «Трасцянец» — той яго часткі, дзе знайшлі свой апошні прытулак тысячы вязняў яўрэйскага гета. Паездка ў Бабруйск і абмеркаванне з кіраўніцтвам горада праекта ваенна-патрыятычнага мемарыяла на тэрыторыі тамтэйшай крэпасці, дзе ў гады апошняй вайны фашыстамі было закатавана і расстраляна 127 тысяч савецкіх ваеннапалонных. Выступленне на мітынгу ў Мінску ў Міжнародны дзень памяці ахвяр халакосту. Яму, безумоўна, лепей было б устрымацца пры сённяшнім стане здароўя ад лішніх эмоцый, хвалявання, але і як старшыня Саюза беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і суполак, і як сумленны сын свайго народа зрабіць гэтага не мог.

А яшчэ між гэтымі клопатамі былі здымкі для тэлебачання, сустрэча з кіношнікамі, якія маюць намер зняць пра Майстра паўнаметражны дакументальны фільм. Я ўжо не кажу пра дзясяткі штодзённых тэлефонных званкоў ад сяброў, калег, знаёмых, і кожнаму з іх трэба было нешта параіць, падказаць ці проста выказаць словы падтрымкі.

А тут яшчэ я са сваімі бясконцымі пытаннямі, уедлівымі роспытамі. Але ні разу, ні на імгненне я не адчуў з боку Леаніда Мендэлевіча нейкай адчужанасці, абыякавасці, стомленасці, не мільгнула на твары і ценю якога-небудзь раздражнення, нецярплівасці. На працягу ўсіх нашых сустрэч і размоў — пастаянная ўвага, нязменная добразычлівасць, ветлівасць, поўная адкрытасць і шчырасць.

СЛУХАЦЬ МУЗЫКУ АРХІТЭКТУРЫ

— Леанід Мендэлевіч, давайце крыху адыдзем ад практыкі і звернемся да тэорыі. Ёсць прыгожае азначэнне, што такое архітэктура. Гэта, вобразна кажучы, застылая музыка ў камені. А як на ваш погляд?

— Я неяк не задаваўся гэтым пытаннем. Але мы сапраўды любім гэты выраз: застылая музыка. Трэба толькі ўмець слухаць гэтую музыку. А яшчэ я сказаў бы, што архітэктура — гэта своеасаблівы летапіс эпохі. Чаму? Таму што яна адлюстроўвае і стан душы аўтара, і стан людзей, якія жылі ў той ці іншы час, ды і сам час з усімі яго настроямі і асаблівасцямі.

Архітэктар не можа проста так нешта прыдумваць, ствараць у адрыве ад рэальнасці. Ён, у прынцыпе, — слуга сацыяльнага заказу. На жылы дом, на офіс, на гасцініцу, на бальніцу. І робіць свой праект ужо ў залежнасці ад патрабаванняў часу, у якім жыве, ад той моды, якая на гэты час існуе. Як ні дзіўна, але на архітэктуру таксама ўплывае мода, і ўплывае дастаткова моцна. Асабліва цяпер, калі адкрыліся межы, калі ёсць інтэрнэт, даступныя ўсемагчымыя часопісы. І як толькі недзе нешта з'яўляецца новае, арыгінальнае, цікавае — яно тут жа становіцца набыткам усёй архітэктурнай супольнасці.

Людзі імкнуцца пераймать лепшае. Я не кажу, што гэта безумоўны плюс. Ёсць тут і пэўны мінус. Перайманне часта забівае сваё, нацыянальнае. Як супрацьстаяць гэтай бядзе, трэба вучыцца ў кітайцаў. Не адстаючы ад сучаснай моды, яны разам з тым умеюць захоўваць і нацыянальны каларыт.

Павінен сказаць, што ў архітэктуры гэта даецца няпроста. Калі ўзяць, скажам, музыку, то ў творах беларускіх кампазітараў, як правіла, захоўваецца свая меладычнасць, адчуваецца свой каларыт. Тое ж самае ў творах нашых пісьменнікаў. Там абавязкова будзе адлюстравана і беларуская душа, і беларуская прырода. У архітэктурных жа праектах нацыянальнае выяўляецца ў меншай ступені. Таму што мы, паўтарыся, знаходзімся пад уплывам сусветнай моды. Шкло, бетон, выгнута, увагнута... Часам нават больш увагі звяртаецца на знешні эфект, чым на функцыю. У выніку знайсці глыбока нацыянальны аб'ект, які б, што называецца, урос сваімі каранямі ў традыцыі, звычаі Беларусі, цяжка. Я гавару гэта адкрыта — праблема дастаткова сур'ёзная.

— У якасці станоўчага прыкладу, на мой погляд, можна прывесці архітэктурна-скульптурны мемарыяльны комплекс «Хатынь». Ён абсалютна нацыянальны. Яго нельга перанесці ў якую-небудзь іншую краіну. Ён наш, беларускі. І самае галоўнае: вы паказалі і даказалі, што і глыбока нацыянальнае можа набываць шырокае грамадскае, агульначалавечае гучанне.

— Пры гэтым заўважце, што хатынская тэма вырашана не сродкамі скульптуры, а галоўным чынам архітэктуры. Хацелася б, вядома, каб гэты факт сапраўды стаў добрым прыкладам для нашых маладых архітэктараў. Таму што пройдзе яшчэ пакаленне — і мы можам згубіць сваю адметнасць, сваю непаўторнасць, проста растварыцца ў агульнай плыні.

Вось зараз у нас шмат будуюць масквічы. Будуюць якасна, прыгожа. Але па-свойму. У іх свая архітэктура. І мы так незаўважна можам ператварыцца ў «прыгарад» Масквы. Разумееце?

Хаця Мінск мае свой твар, сваю планіроўку, свае архітэктурныя структуры. Свой водна-зялёны дыяметр. Аснова закладзена добрая. Ёсць на што абапірацца.

Я не супраць масквічоў, барані Бог. Але да таго, што яны прапануюць, трэба ставіцца вельмі ўважліва, асцярожна. Сіці ёсць усюды. Ну а калі мы ўжо будуем сваё сіці, то яно павінна быць менавіта нашым. Каб яно было з нацыянальным каларытам. Гэта не значыць, што на фасадах дамоў павінен прысутнічаць беларускі арнамент і іншыя падобныя рэчы. Тут патрэбна больш глыбокая сувязь з нацыянальнымі традыцыямі. І гэта вельмі важна.

Вось быў у нас такі архітэктар Іосіф Лангбард. І хоць сам ён з Пінцера, але ў Мінску стварыў шэраг

Фота БЕЛТА.

Леанід Левін на адкрыцці мемарыяльнага комплексу дзецям — ахвярам вайны і чарнобыльскай катастрофы 28 чэрвеня 2007 года ў вёсцы Красны Бераг Жлобінскага раёна.

цудоўных будынкаў — Дом урада, Дом афіцэраў, тэатр оперы і балета, галоўны корпус Акадэміі навук Беларусі. Стыль гэтых будынкаў спакойны, грунтоўны, без мудрагелістасці. Архітэктура простая, сціплая. Як і характар беларуса. Лангбард у сваіх творах змог знайсці такі вобраз, які вырас з нашай зямлі, з менталітэту нашых людзей.

Чаму я пра гэта гавару? Таму што архітэктура — не толькі твар горада, але і твар таго пакалення, сярод якога жыў і тварыў Майстар. Па архітэктуры даследчыкі мяркуюць, як людзі жылі да нас, якія ў іх былі густы, звычаі, запатрабаванні.

Разумееце, архітэктура была і будзе музыкай, маці ўсіх мастацтваў. Яна заўсёды жыла ў садружнасці з жывапісам, скульптурай, нават з музыкай, словам. Вось чаму нельга аддаваць архітэктуру на водкуп, на густ аднаго чалавека — гэта можа прывесці да кепскіх наступстваў...

— Леанід Мендэлевіч, а як вызначыць, дзе канчаецца будаўніцтва і пачынаецца архітэктура?

— Гэта працэс складаны. Ад першабытнай пячоры да сучасных гарадскіх пабудоў — дыстанцыя вялізнай адлегласці. Чалавеку ў пячоры спачатку спатрэбілася акно, пасля — дзверы, пасля захацелася схавацца пад дах. Вось так паступова эвалюцыя ішла ў залежнасці ад эканомікі, ад эстэтычных густаў, ад магчымасцяў будаўнічай галіны. А калі адказваць на ваша пытанне канкрэтна, то мне здаецца, архітэктура пачынаецца там, дзе прарастае эстэтыка, дзе, акрамя манатонных плоскасцяў, панылых вертыкаляў і гарызанталяў, ёсць яшчэ мастацкія дэталі, элементы прыгожага, прывабнага.

— У гэтым плане, як мне здаецца, узорам можа служыць наш праспект Незалежнасці ў Мінску. Па праўдзе кажучы, ён мне падабаецца нават больш, чым Неўскі ў Пецеры.

— На самой справе — гэта наш гонар. Яшчэ не скончылася вайна. Яшчэ дымілася вызвалены Мінск. А лепшыя архітэктары краіны ўжо працуюць над генеральным планам яго забудовы. Галоўная вуліца сталіцы не проста адраджаецца — пашыраецца, практычна будуецца нанова. Што ні дом на праспекце — гісторыя. Што ні аўтар — асоба. Дарэчы, адбудоўвалі Мінск не толькі беларускія дойліды, але і масквічы, піцерцы. Акадэмікі М.Парушнікаў, А.Шчусеў, М.Колі, знакамітыя архітэктары М.Баршч, А.Мардвінаў, Б.Рубаненка і іншыя. І з якой адказнасцю яны падышлі да выканання пастаўленай ім задачы, з якой душой стваралі кожны праект! Я нават сказаў бы (хай на мяне не крыўдуюць сучасныя архітэктары) зрабілі сваю справу з большай душой, чым тое, што робіцца ў Мінску сёння.

— І вось парадокс: краіна ляжала ў руінах, ва ўсім панавала нястача, галеча, а сродкі, каб будаваць такі праспект, такія цудоўныя дамы знаходзілі. Глядзелі далёка ў перспектывы.

— Так, так. Рабілі, як кажуць, на стагоддзі. Дабротна, прыгожа. І фасады, і планіроўку. Тады была свая мода — сталінскі рэнесанс, класіцызм. Прыгажосць заахвочвалася, насаджалася.

— А як вам падабаецца сённяшняя забудова Мінска і, у прыватнасці, забудова праспекта Пераможцаў?

— Ён жа складаецца з некалькіх частак. Ёсць старая частка, якая вытрымана ў больш-менш адзіным стылі. Будаўніцтва тут вялося ў сямідзясятыя-васьмідзясятыя гады і лепшыя традыцыі яшчэ захоўваліся. А ёсць ужо новыя мікрараёны, такія, як Вяснянка, Лебядзіны. Тут ужо кожны інвестар-забудоўшчык тварыў, што хацеў. Замахнуліся нават на самае святое — паступова пачалі знішчаць водна-зялёны дыяметр.

— Мяне асабліва засмучаюць гэтыя бясконцыя гандлёва-забаўляльныя цэнтры, гэтыя шматлікія казіно. Яны проста рэжуць вока.

— Усё можна будаваць. Але дзенебудзь за кальцавой дарогай. Тут патрэбна цвёрдая рука галоўнага архітэктара сталіцы. Ён, як дырыжор, павінен кіраваць забудовай, пільна сачыць, каб не парушаўся агульны архітэктурны ансамбль.

— Так, як гэта адбылося на Нямізе... А цяпер і вінаватых не знойдзеш.

— Ведаеце, я асабліва і папракаць іх не хачу. Яны падпалі пад прэс заганнай канцэпцыі. Тады, пры рэканструкцыі Мінска, лічылася, што іншага выйсця няма, як рабіць паралельны дублёр Ленінскаму праспекту. Да таго ж, многія Нямігу з яе састарэлымі трушчобамі ўспрымалі як нейкую недарэчнасць у цэнтры горада.

— А вось на ваш погляд, усё гэта можна было пакінуць?

— Можна і трэба было. Гэта ж звязана з нашай гісторыяй. У нас не так многа засталося помнікаў даўніны. А тое, што ацалела, варта берагчы асабліва. Вось мы рабілі рэканструкцыю Траецкага прадмесця. Нас крытыкавалі, лаялі — і тое не так, і тое не гэтак. Можа, першы блін і комам. Але ж гэты блін сёння ёсць.

— А па-мойму, дык зроблена ўсё вельмі прыстойна. Не сорамна любым гасцям паказаць.

— Я сваім крытыкам часам кажу: так, там шмат архітэктурных пенак, але ж мы працавалі ў цесным саюзе з рэстаўратарамі. Працавалі па старых чарцяжах, падняўшы ўсе магчымыя архівы. І мы захавалі ўсю структуру колішняга Траецкага прадмесця. Адзінае, чаго мы не захацелі рабіць — гэта добраўпарадкаваць тэрыторыю такой, якой яна была ў тыя часы. Мы зрабілі яе сучаснай, прыгожай і зручнай. І, можа, самае галоўнае: рэканструкцыяй Траецкага мы паказалі мінчанам, што старую забудову трэба не разбураць, а даводзіць да ладу і ганарыцца.

— А чаму не атрымалася гэтак з Верхнім горадам?

— Мы пачыналі работы і там. Былі вялікія планы. Але потым гэтую тэрыторыю забралі ў свае рукі «новыя рускія». Цэлыя ўчасткі аддавалі інвестарам, а яны, не зважаючы на даўніну, на нашы традыцыі, будавалі сваё. І разбурылі Верхні горад цалкам.

— А вось уявіце сабе, які быў бы цудоўны ансамбль — Траецкае прадмесце, Верхні горад ды яшчэ Нямігa.

— Плюс Ракаўскае прадмесце. Плюс старая прамысловая архітэктура на беразе Свіслачы за гасцініцай «Беларусь». Мы ж там ужо былі нават прыступілі да рэалізацыі цікавага праекта «Вытокі».

— І што гэта быў за праект?

— Задуманы быў цэлы комплекс розных аб'ектаў. Дом народных рамёстваў, гандлёвы цэнтр, гасцініцы, драматычны тэатр, выставачны павільён... Старыя будынкі рэстаўраваліся, арганічна ўпісваліся ў адзіны ансамбль.

— І што?

— Будоўлю спынілі. Узведзеныя падмуркі засыпалі. І, можна сказаць, на магіле нашай спадчыны пасеялі травіцу, зрабілі клумбы, дарожкі... Пройдзе час, новае пакаленне і ведаць не будзе, што тут была гістарычная частка горада. Вось так зневажальна, калі не сказаць больш рэзка, мы ставімся да сваёй спадчыны, да сваёй гісторыі. І вінаватыя ў гэтым не толькі кіраўнікі горада. Частку віны павінны ўзяць на сябе і архітэктары — за тое, што не змаглі адстаяць, даказаць, пераканаць.

— Леанід Мендэлевіч, вы згадалі водна-зялёны дыяметр. Ведаю не па чутках, як карпатліва яго ствараліся, па-гаспадарску ахоўвалі. Цяпер жа гэты дыяметр паціху разбураецца.

— Ды не паціху, а вельмі актыўна! Уся тэрыторыя, пачынаючы ад музея Вялікай Айчыннай вайны і ажно да Драздоў, ужо практычна перакапана, забудавана. Каля Траецкага прадмесця ўляпілі вышынны будынак, які літаральна прыдушыў і само прадмесце, і оперны тэатр. У парку імя Горкага, там, дзе калісьці была першая ў горадзе электрастанцыя, будуецца гатэль. На беразе Свіслачы, каля завода імя Кірава, зноў-такі ў самым цэнтры цікавага парку кітайцы ўзводзяць цэлы гасцінічны комплекс.

— А куды ж глядзіць Саюз архітэктараў? У вас жа нядаўна быў з'езд, і што, гэтая праблема не падымалася?

— Падымалася, але так, праз коску, павярхоўна. Ды што цяпер гэтыя нашы з'езды? Гэта хутчэй шоу, чым сур'ёзная размова аб набалелых праблемах. Яркай, вострай палемікі практычна не бывае. Таму і рэакцыі ніякай.

Раней усё было па-іншаму. Мы чакалі з'ездаў нашага творчага саюза, рыхтаваліся да іх. А якія там кіпелі страсці! Цяпер жа ў нашага брата чамусьці стаўленне да сваіх форумаў куды менш сур'ёзнае. Прыбеглі хто з майстэрні, хто з кавярні. У джынсах, куртачках. А павінны былі б прыйсці хаця б у касцюме з гальштукам. Каб адчувалася — прыйшлі інтэлектуалы, людзі, якія чыняць лёс горада. Напэўна, маім калегам здаецца, што гэта сучасна, дэмакратычна. А гэта — дэвальвацыя пэўных каштоўнасцяў і паняццяў, зніжэнне іміджу высокага звання архітэктара.

— Тады хачу ў вас запытацца: а якімі якасцямі, акрамя сваёй прафесійнай падрыхтоўкі, павінен валодаць сучасны архітэктар?

— Не толькі сучасны, але і ва ўсе часы архітэктар быў і застаецца фігурай сінтэтычнай. Ён павінен дасканала ведаць будаўнічую справу...

А яшчэ архітэктар павінен валодаць адпаведнымі валявымі якасцямі. Каб адстаяць сваю пазіцыю, пераканаць чыноўніка ў правільнасці, неабходнасці свайго рашэння. У нас шмат развялося ўсялякіх «саветаў». З аднаго боку, гэта няблага, што ёсць каму параіць, падказаць і, магчыма, перасцерагчы ад памылкі. А з другога, калектыўная апека з'яляецца вялікім тормазам для развіцця індывідуальнага стылю. За мяжою, дарэчы, такіх рад няма. Там архітэктару ўказваюць толькі месца будоўлі і вышыню будынка. І — усё. А што ён і як будзе рабіць — якія вокны: квадратныя ці круглыя, які фасад, карніз і таму падобнае — гэта ўжо справа яго густу.

У нас жа на абмеркаванне праекта збіраецца чалавек дваццаць-трыццаць, і кожны хоча, прабачце, выпендрыцца, паказаць, што ён заўважыў нешта важнае, прынцыповае. І даюць сотні заўваг, нярэдка ўзаемавыключальных, якія прымушаюць нешта перарабляць, нешта дабаўляць, адным словам, гвалтуюць архітэктара. Інакш праекту не дадуць пуцёўку ў жыццё. І хто пасля ў яго будзе пытацца: гэта табе параілі зрабіць такую брыдоту ці ты сам яе дапусціў па сваёй бяздарнасці?

Вось чаму многія дойліды ідуць на такую хітрасць: у праекце дамалёўваюць, як мы кажам, якога-небудзь «сабачку». На абмеркаванні члены рады ўчэпяцца ў гэтага «сабачку» — і давай крытыкаваць. Тады аўтар кажа: ладна, здыму яго, калі вы так крытыкуеце. І здымае. Усе задаволеныя. А аўтар удвая: галоўнае ў праекце ўдалося захаваць.

Важна была пасля «Хатыні» трымаць планку. Пётр Міронавіч нас папярэджваў: «Цяпер на вашу галаву пальецца не толькі фіміям, але і пасыплюцца камяні. Вытрымаеце — значыць, Бог з вамі». Я хоць і не вернік, але ўдзячны нябёсам, што памаглі вытрымаць выпрабаванні.

ЖЫЦЦЯ ПАКРУЧАСТЫЯ СЦЕЖКІ

— Леанід Мендэлевіч, давайце мы ад агульных разважанняў зноў пяройдзем да канкрэтных фактаў вашай біяграфіі. Скажыце, калі ласка, стаць архітэктарам — гэта было вашае асабістае жаданне ці жаданне вашых бацькоў?

— Гэта быў мой выбар і маё жаданне. Справа ў тым, што я з дзяцінства вельмі любіў маляваць. І колькі помню сябе, увесь час маляваў, маляваў... Натуральна, што, скончыўшы школу (а скончыў яе з залатым медалём), мая жыццёвая сцежка была ўжо фактычна прадвызначана. Мой выбар заключаўся толькі ў тым, каб вырашыць, якому інстытуту аддаць перавагу: тэатральна-мастацкаму ці політэхнічнаму з яго архітэктурным факультэтам. Я выбраў архітэктуру.

— Звычайна малады спецыяліст мае патрэбу ў парадах, у падтрымцы больш вопытнага чалавека. А ў вас ці былі такія настаўнікі па жыцці?

— Ведаеце, я скажу зараз дзіўную рэч. Першыя ўрокі мастацтва мне давала... сонца. Гэта было ў далёкай Кіргізіі, у гарадскім пасёлку Кара-Балты, дзе мы разам з мамай апынуліся ў эвакуацыі. Вельмі часта мяне, пяцігадовага хлопчыка, пакідалі дома аднаго, замкнуўшы кватэру на ключ. У пакоі было маленькае-маленькае акенца, праз якое ў ясную пагоду прабівалася сонца. Я гуляў з яго промнямі, лавіў сонечных зайчыкаў і не мог адарваць вачэй ад каляровых вясёлак, якія сонца малявала на сцяне. І мне таксама хацелася маляваць...

Пазней, калі я ўжо вучыўся ў мінскай сярэдняй школе, маім першым сапраўдным настаўнікам у мастацтве стаў Сяргей Пятровіч Каткоў. Ён умеў знаходзіць нас, хлапчукоў, на развалінах Мінска і аднаго за адным прывабліваць да заняткаў у мастацкую студыю пры Доме піянераў. Сяргей Пятровіч па-свойму стараўся кампенсаваць нам тое, што адняла вайна. Лячыў нашы параненыя душы мастацтвам. Мы малюем неба, горад, прыроду. Ездзім у Белавежскую пушчу. На возера Нарач. У поле. У лес. Мы прагна ўбіраем колеры і пахі навакольнага жыцця, наталяемся сокам роднай зямлі.

А першым і, бадай, галоўным настаўнікам у маёй прафесіі стаў выдатны беларускі архітэктар Георгій Заборскі. Ён вёў у нас на факультэце заняткі па спецыяльнасці, а пасля таго, як я на чацвёртым курсе на «выдатна» выканаў курсавую работу, запрасіў мяне на працу ў сваю майстэрню.

Многім я ўдзячны свайму незабыўнаму настаўніку. Яго творчыя і жыццёвыя ўрокі вельмі дапамаглі мне ў маім прафесійным і грамадзянскім сталенні.

У гэтым сэнсе я магу назваць сваімі настаўнікамі і Аляксандра Воінава, і Мікалая Гусева, і Наталлю Макляцову. Яны вучылі сваім прыкладам, сваёй творчасцю. Перасцерагалі ад сляпога капіравання, раілі ісці сваім шляхам.

А яшчэ — не здзіўляйцеся! — маімі настаўнікамі ў самым высокім сэнсе гэтага слова былі Янка Купала і Якуб Колас. Яны, можа, больш чым хто фарміравалі мой светапогляд, маю любоў да роднай зямлі. Іх творы — жыццядайная крыніца і для душы, і для розуму.

— Леанід Мендэлевіч, людзі вашай прафесіі звычайна трымаюцца сваёй адасобленай кастай. У вас жа, наколькі я ведаю, ёсць добрыя знаёмыя, нават сябры і сярод мастакоў, і сярод пісьменнікаў, і сярод кампазітараў. Як вам гэта ўдаецца?

— Ведаеце, я спецыяльна не шукаю гэтых знаёмстваў. Усё атрымліваецца само сабой, у сілу розных абставін. Скажам, дружба з Анатолем Анікейчыкам пачалася падчас сумеснай працы. Але нам цікава было гаварыць не толькі на творчыя, а і на самыя розныя тэмы. Нас яднала і агульнасць нашых грамадзянскіх пазіцый.

Вельмі цёплыя склаліся ў нас адносіны з Заірам Азгурам. І хоць часам мы вострa спрачаліся, як, напрыклад, на будаўніцтве скульптурнай кампазіцыі на плошчы Якуба Коласа, адкуль ён нават прагнаў мяне, але гэтыя спрэчкі ніколі не перашкаджалі нам вырашаць самыя сур'ёзныя творчыя задачы. Мне здаецца, што нашыя зносіны былі ўзаемацікавыя і ўзаемакарысныя.

З Сяргеем Грахоўскім мы блізка пазнаёміліся ў санаторыі «Аксакаўшчына». Ведаеце, агульныя беды хутка збліжаюць людзей. За два тыдні, што мы правялі разам у не самых лепшых абставінах, Сяргей Іванавіч адкрыўся мне не толькі як таленавіты паэт, але і як чалавек складанага, неардынарнага лёсу.

Юрый Градаў, Леанід Левін, Валянцін Занковіч разам з Пятром Машэравым на адкрыцці мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Чэрвень. 1968 г.

Гады выпрабаванняў у ГУЛАГу не азлобілі яго, не зрабілі помслівым. Засталіся добрыя адносіны да ўсяго, што было навокал. Наша сяброўства працягвалася да апошніх яго дзён. Ён бываў у нас дома, вельмі любіў нашу дачку Галю. Я быў у яго на радзіме, у Глуску.

Самыя цёплыя, самыя светлыя ўспаміны засталіся ад сустрэч і гутарак з Максімам Танкам. Нам было пра што пагаварыць. Ён не толькі выдатна ведаў літаратуру (беларускую, польскую і іншыя), але і грунтоўна быў знаёмы з творчасцю Сальвадора Далі, Марціраса Сар'яна, Мікалоюса Чурлёніса... Пры яго шырокай вядомасці, гучнай паэтычнай славе заставаўся надзвычай сціплым і абаяльным чалавекам.

Вельмі любіў і люблю Васіля Быкава. Я не маю права называць яго сваім сябрам, хоць мы часта бачыліся, пра многае гаварылі.

Гэта былі вялікія мастакі, сапраўдныя творцы — як зоркі Вялікай Мядзведзіцы. Зносіны з імі давалі не толькі душэўную радасць, але і духоўнае наталенне. Кожная сустрэча рабіла цябе больш шчодрым і багатым. Як і цяперашнія сутрэчы з Ігарам Лучанком, Генадзем Бураўкіным, Валерыем Анісенкам...

— Вы ўмееце дараваць людзям?

— Так, я не трымаю зла. Жыццё паказала, калі пачынаеш на зло адказваць злом, помсціць, то ўсё гэта не прыводзіць да станоўчага выніку. Вядома, я балюча перажываю ўсялякія інтрыгі, здрады. Але разумею: усё гэта чалавечыя слабасці, і іх трэба не тое што дараваць, а быць вышэй за гэта.

— А ці ёсць рэчы, якія дараваць нельга?

— Вядома ж, ёсць. Скажам, подласць у чыстым выглядзе. Подласць усвядомленую, прадуманую, езуіцкую. І ўсё ж я лічу, што лепш не апускацца да ўзроўню помсты. Куды больш плённа дараваць чалавеку і забыць. Праўда, наша грамадства яшчэ не гатовае да такога. Большасць людзей любяць узяць свайго крыўдзіцеля за грудкі і даць па мордзе. А вось проста прамаўчаць і гэтым маўчаннем, можа быць, пакараць чалавека яшчэ мацней — такое чамусьці атрымліваецца рэдка. Мы прывыклі да больш радыкальных захадаў.

Я ж выхаваны ў тым духу, што чалавечыя адносіны павінны быць чалавечымі. І заўсёды трэба падыходзіць да свайго апанента з разуменнем. І вось калі ты станеш на яго месца і зможаш яго зразумець, то наўрад ці ўзнікне жаданне хапацца загрудкі. У горшым выпадку не падасі яму руку.

— У вашым жыцці было шмат трагедыйнага, містычнага. Прынамсі, тройчы вы былі на мяжы жыцця і смерці. Першы раз, калі суседка па лесвічнай пляцоўцы выйшла, каб вынесці смецце, і дзверы замкнуліся. А ў кватэры спіць малое дзіця. І жанчына прыбегла да вас з просьбаю пералезці цераз балкон і адамкнуць дзверы. Не думаючы пра небяспеку, вы палезлі. І сарваліся. З чацвёртага паверха. Ад бяды ўратавала толькі тое, што зачапіліся сарочкай за нейкі жалезны крук...

У другі раз было яшчэ горш. Вы на аўтамашыне ехалі з Масквы. Утраіх. Вы — за рулём, побач — Селіханаў, Занковіч ззаду. Выехалі позна. У кепскае надвор'е: мёў снег, коўзка. «Дворнікі» не спраўляліся ачышчаць лабавое шкло. Сустрэчныя машыны сляпілі вочы. Здарылася ўсё нечаканa. Машыну занесла і, перакуліўшыся, яна паляцела пад адхон. Я не ведаю, як гэта назваць — цудам, містыкай? — але ўсе засталіся жывыя.

І апошні выпадак. Памятаеце, Валгаград, «Салдацкае поле»... Трэба было з сабранага металу вайны зварыць пэўную кампазіцыю. А пільны зваршчык адмовіўся гэта рабіць, пакуль сабраныя снарады не праверацъ сапёры. Праверылі — снарады каказаліся «жывымі». Дастаткова было б адной іскры, каб вы разам са зваршчыкам узляцелі ў паветра.

Як вы думаеце, гэта ўсё выпадковасці ці тут бачыцца нешта большае?

— Не, у жыцці нічога не бывае выпадковага. Усё ўзаемазвязана, і ўсё мае свой сэнс. Выпадкі, пра якія вы расказалі, таксама. Бог даў мне суровыя выпрабаванні, але пакінуў на гэтым свеце. Пакінуў, каб я мог выканаць сваю місію да канца.

— Выканалі?

— Лічу, што выканаў. Даруйце за нясціпласць, але, як мне здаецца, тое, што было ў мяне закладзена Усявышнім, я рэалізаваў. Сёння, калі часам азірнуся назад, ажно не верыцца, што можна было гэтулькі зрабіць. Але справа нават не ў колькасці. Важна было пасля «Хатыні» трымаць планку. Пётр Міронавіч нас папярэджваў: «Цяпер на вашу галаву пальецца не толькі фіміям, але і пасыплюцца камяні. Вытрымаеце — значыць, Бог з вамі». Я хоць і не вернік, але ўдзячны нябёсам, што памаглі вытрымаць гэтыя выпрабаванні.

— Якую падзею ў сваім жыцці вы лічыце самай важнай, самай галоўнай?

— Я нават не ведаю... Відаць, усё ж «Хатынь». А яшчэ для мяне вельмі важны і дарагі помнік дзецям — ахвярам вайны.

— Што з задуманага вамі засталося нерэалізаваным?

— Нерэалізаванага многа. Неяк мы з дачкою падлічвалі — аказалася недзе пад сотню праектаў. Я ж удзельнічаў больш чым у пяцідзесяці конкурсах. Шмат разоў выходзіў пераможцам. Але многае засталося за бортам.

— Леанід Мендэлевіч, вы шчаслівы чалавек?

— Думаю, што так. Жыцця майго пакручастыя сцежкі не раз прыводзілі мяне да поспеху, да перамогі. Хаця было ўсялякае — і расчараванні, і няўдачы, і балючыя страты. Гэта толькі збоку здаецца, што жыццё імчала мяне наперад пад белымі ветразямі. Не, даводзілася перажываць і сур'ёзныя штормы. Галоўнае — не збочваць са сваёй дарогі.

— А ў чым, на вашу думку, шчасце?

— Мне здаецца, яго кожны разумее па-свойму. Аднаму варта смачна, сытна паесці — і ён ужо шчаслівы. Другі напіша нешта талковае — і таксама перажывае хвіліны шчасця. Для мяне ж, калі не піжоніцца, заўсёды быў і застаецца шчасцем мой надзейны тыл. Мая сям'я. Я ўсе гады спакойна працаваў, не думаючы пра розныя гаспадарчыя праблемы. Не баючыся, што калі затрымаюся ў майстэрні, то будзе дома скандал. Мне вельмі пашанцавала з жонкай. З Наталляй Мікалаеўнай мы пазнаёміліся яшчэ ў інстытуце — былі на адным курсе, у адной групе. Яна сядзела напарадзе мяне. Яе каса, яе манера паводзін, яе думкі не проста падабаюцца мне — захапляюць. Кожны дзень ператвараецца ў свята. І, дзякуй лёсу, гэтае свята доўжыцца і па сёння.

А яшчэ маё шчасце — дачка Галіна. Яна заўсёды побач са мной. Мой блізкі сябар і аднадумца. У дзяцінстве Галя марыла стаць следчым. У яе пра ўсё была свая думка. Упарта дабівалася свайго. Калі займалася ў балетнай студыі, мы ледзь паспявалі купляць ёй пуанты. У старэйшых класах пачала цікавіцца тым, чым займаюцца яе бацькі. Гадзінамі магла знаходзіцца каля макетаў і планшэтаў. Пайшла ў студыю архітэктараў пры Саюзе архітэктараў. І недзе тады ж прыняла ўдзел у міжнародным конкурсе сярод вучняў. І заняла другое месца. Думаю, што гэты конкурс і вырашыў лёс дачкі. Яна скончыла той жа факультэт, што і мы з Наталляй. Стала прафесійным архітэктарам. І муж у яе — Аляксандр Капылоў — таксама архітэктар. Яна па-свойму бачыць архітэктуру. Па-свойму адчувае лінію малюнка. Па-свойму чуе музыку архітэктуры. Яе захапляе рэстаўрацыя гістарычных помнікаў. У яе праяўляецца паэтычны дар. І я рады, што яна ўжо мае ўласныя зборнікі вершаў, добра ацэненыя чытачамі.

Я перакананы: дом, сям'я — гэта першаснае. А творчасць — другаснае, хаця яна і прыносіць вялізнае задавальненне.

